ДРУГОМУ ЎСЕБЕЛАРУСКАМУ ЗЛЁТУ ЮНЫХ ЛЕНІНЦАЎ БАЛЬШАВІЦКАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַרייניקט זיך!
Proletariusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ГЭЗЕТАЛЬНЕГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

СУБОТА
25 ліпеня 1931 г.
№ 169 (3258)

Зьлёт юных ленінцаў

Сёньня ў сталіцы БССР—Менску адкрываецца другі ўсебеларускі зьлёт піянэраў. На зьлёт прыбудзе 800 дэлегатаў-прадстаўнікоў двухсоттысячнай арміі юных ленінцаў. Зьлёт падагуліць вялізарнейшы вопыт прароблены работы піянэрскімі арганізацыямі і намеціць канкрэтныя пляны іх далейшай дзейнасьці. Піянэры, пад кіраўніцтвам партыі і ленінскага камсамолу, прымаюць актыўны ўдзел у будаўніцтве сацыялізму, прымаюць актыўны ўдзел у клясавай барацьбе.

Мы маем цэлы рад прыкладаў, калі піянэры дапамагалі парэйным арганізацыям на—фабрыках весьці барацьбу з прагуламі, з разгільдяйствам, за выкананьне прамфінпляну, на вёсцы—ў арганізацыі калгасаў. Актыўнасьць, баявая гатоўнасьць піянэрскіх арганізацый, іх малады ленінскі запал—вось характарная рыса юных ленінцаў. Партыя і савецкая ўлада камуністычнаму выхаваньню моладзі надаюць выключнае значэньне. Таму работа сярод піянэрскіх арганізацый зьяўляецца ня толькі работай саміх піянэраў, але ўсіх парэйных, савецкіх і камсамольскіх арганізацый.

Піянэр-арганізацыі за апошнія часы дасягнулі вялізарнейшых посьпехаў. Калі да першага ўсебеларускага зьлёту піянэраў налічвалася 79.541, дык цяпер звыш 200 тысяч. Разам з тым, значна ўзрасла актыўнасьць і ўдзельная вага піянэрскіх арганізацый у справе камуністычнага выхаваньня падрастаючага пакаленьня. Праведзеныя раённыя зьлёты піянэраў прайшлі пад знакам далейшай мабілізацыі грамадзкасьці на справу камуністычнага выхаваньня дзяцей. Перад другім усебеларускім зьлётам стаіць вялізарнейшая задача — намеціць канкрэтныя мерапрыемствы выкананьня рашэньняў IX зьезду камсамолу аб арганізацыі пры кожным калгасе, саўгасе піянэрскага атраду, каб «ахапіць на 100-проц. дзяцей калгасьнікаў, беднякоў-адноасобнікаў піянэрскай арганізацыяй».

Піянэрскі рух у СССР расьце і мацнее. Але і ня толькі ў СССР. У капіталістычных краінах дзеці рабочых, дзеці батракоў арганізуюцца ў піянэрскія атрады і дапамагаюць сваім бацькам весьці барацьбу з дыктатурай буржуазіі, за дыктатуру пралетарыяту. Буржуазія добра ўлічвае важнасьць выхаваньня дзяцей у духу патрыятычна-клерыкальным, у духу нявольніцтва. Таму супроць піянэрскіх арганізацый прымаюцца меры дзікага тэрору. У краінах, дзе фашысцкая дыктатура загнала ў глыбокае падпольле камуністычную партыю, піянэрскія арганізацыі таксама забаронены, таксама знаходзяцца ў глыбокім падпольлі. У фашысцкай Польшчы, Румыніі і г. д. дзяцей піянэраў засуджаюць на катаргу на доўгія гады.

Але ня гледзячы на тэрор піянэрскія арганізацыі ва ўсіх краінах растуць лічбова, расьце іх баяздольнасьць, загартаванасьць і ўсё больш і ўсё часьцей выступаюць піянэры як актыўныя дапаможнікі сваім бацькам у барацьбе супроць паняволеньня капіталу, за дыктатуру пралетарыяту.

Дзеці рабочых, дзеці працоўных у капіталістычных краінах знаходзяцца ў жупасным становішчы. Звыш 25 млн. рабочых без работы і іх дзеці пухнуць з голаду, абадраныя, ня маюць прытулку. Капіталісты эксплёатуюць дзяцей за мізэрную плату. Дзеці працуюць у пячувана дрэнных умовах. Сотні тысяч хворых на сухоты і іншыя хваробы. Ніякіх законаў аб ахове дзяцей, аб забароне эксплёатацыі іх у шкодных прадпрыемствах, а таксама на начных работах у капіталістычных краінах фактычна ня існуе.

І пралетарская дзетвара загартоўваецца на фабрыках, у барацьбе з эксплёататарамі, арганізуецца для супольных выступленьняў у піянэрскія атрады. Камуністычная партыя і камсамол кіруюць барацьбой юнакоў, узбагачаюць іх сваім баявым вопытам.

У Савецкім Саюзе дзецям рабочых, дзецям калгасьнікаў і ўсіх працоўных забясьпечана поўная магчымасьць як фізычнага, так і культурнага развіцьця. У той час калі ў капіталістычных краінах сотні тысяч дзяцей ня могуць вучыцца, у нас, у Савецкім Саюзе, уведзена абавязковае ўсеагульнае навучаньне.

Перад піянэр-арганізацыямі, перад усёй савецкай грамадзкасьцю стаіць вялізарнейшая адказнейшая задача—ахапіць на ўсе 100-проц. дзяцей працоўных піянэр-арганізацыямі. Яшчэ больш узмацніць інтэрнацыянальную сувязь і інтэрнацыянальнае выхаваньне падрастаючага трэцяга пакаленьня.

Піянэры былі, ёсьць і будуць дапаможнікамі партыі, дапаможнікамі камсамолу ў барацьбе, на фронце пабудовы сацыялістычнага будаўніцтва. Піянэры актыўна ўдзельнічаюць і надалей будуць удзельнічаць у справе ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны, у справе падрыхтоўкі загартаваных, адданейшых барацьбітоў за справу сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі, барацьбітоў за сусьветны Кастрычнік.

Наперад, малады атрад юных ленінцаў, да новых перамог пад сьцягам камуністычнай партыі!

На фронце сенаўборкі

ПРАРЫВАЎ НЕ ПАВІННА БЫЦЬ

Усе сілы на касавіцу! Выканаць плян сенаўборкі

ЗВОДКА

аб ходзе касьбы і ўборцы сенажацяй і сеяных траў па БССР на 20 ліпеня.

Назва сэктароў	Натуральн. сенажаці: Плян у га	Скошана у га	Проц. выкан.	Шматгадов. траў: Плян у га	Скошана у га	Проц. выкан.
Па саўгасным	70929	29337	41,9	9412	9490	100,1
Па калгасным	726750	367000	50,5	49749	61912	124,4
Па аднаасобным	1068010	433057	40,5	62530	46730	74,7
Разам	1865689	829394	44,5	121711	118132	97,1

Заўвага: перавыкананьне плану ўборкі шматгадовых траў па калгасах тлумачыцца тым, што ў зьвязку з новым прылівам павялічылася плошча шматгадовых траў.

Посьпехі калгасу „Новае жыцьцё"—

перамога зьдзельшчыны

Калгас «Новае Жыцьцё» Пагоскага сельсавету, Старобінскага раёну яшчэ пасьля сканчэньня сяўбы адразу пачаў рыхтавацца да ўборачнай кампаніі. Своячасовая падрыхтоўка дала свае вынікі. Калгасам на 20 ліпеня ўбрана 245 га сенажаці і 30 га канюшыны. Калгас «Новае Жыцьцё» першы ў раёне наладзіў у час сенаўборкі грамадзкае харчаваньне на сенажаці. Для ўборкі вікі і канюшыны былі арганізаваны брыгады з падлеткаў і старых. Гэта першая спроба была ўдалая.

Калгас перайшоў на зьдзельшчыну, добра наладжаны вучот працы, усе калгасьнікі маюць на руках працоўныя кніжкі. У часе сенаўборкі дзякуючы шырока разгорнутаму сацспаборніцтву і ўдарніцтву паміж брыгадамі, нормы выпрацоўкі па касьбе перавыконваліся на 60 проц.

Калгас добра падрыхтоўваўся да ўборкі ўраджаю; падрыхтаваны ўборачныя машыны. Складзены плян уборкі. Уборку ўраджаю мяркуюць скончыць за 15 дзён.

Сваёй узорнай работай калгас выклікаў вялікі прыліў. У апошні час у калгас уступіла 10 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Кожны дзень аднаасобнікі падаюць заявы аб уступленьні ў калгас.

Шчавель.

Будзёнаўцы скончылі сенаўборку

Калгас імя Будзёнага, Старобінскага сельсавету, дзякуючы ўдарнай рабоце скончыў сенаўборку. Уся работа ў калгасе праводзілася на аснове шырока разгорнутага сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж асобнымі брыгадамі, на аснове зьдзельшчыны. Нормы выпрацоўкі калгасьнікамі перавыконваліся амаль у два разы.

Калгас скончыўшы ўборку сенажаці ўзяў на сябе абавязацельства дапамагчы суседняму саўгасу ўбраць сенажаці. Зараз калгас прыступіў да ўборкі ўраджаю.

В. Майскі.

Змагаемся за ганаровы сьцяг

Жлобін. 22-VII. (Белкта). Калгас імя «11-годзьдзя Кастрычнікавай рэвалюцыі» першы па раёне скончыў сенаўборку. Плян уборкі—85 га канюшыны і 215 га сенажаці—выканан цалкам. Калгас загатовіў канюшыны 9.500 пуд., сена—21.300 пуд. Уся праца праводзілася на аснове зьдзельшчыны. У калгасе добра пастаўлены вучот работы. За бальшавіцкія ўзоры працы ў часе сенаўборачнай прэміяваны 2 брыгады, з іх адна жаночая. Калгас пераключыўся на ўборку збожжа; ужо зжата 35 га жыта.

Раённая газэта «Шлях Сацыялізму» ўзьняла пытаньне перад прэзыдыумам РВК аб узнагародзе калгасу пераходным сьцягам Жлобінскага РВК.

Папярэдзіць зрыў сенаўборкі

Сенаўборка ў калгасе «Чырвоны Прафінтэрн» Сьмілаўскага раёну гнебна зрываецца. Калгас мае больш як 350 га сенажацяй, а на сёньняшні дзень скошана толькі 85 га, што складае 22 проц., Такі злачынны зрыў сенаўборачнай тлумачыцца поўным развалам працоўнай дысцыпліны ў калгасе. У калгасе ня ўведзена зьдзельшчына, не наладжаны правільны вучот працы, зусім адсутнічае сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Кожны дзень на работу зьяўляецца толькі 50 проц. усіх працаздольных жанчын. Сярод калгасьнікаў не вядзецца ніякай растлумачальнай работы. Партыйныя і камсамольскія арганізацыі зусім забыліся пра існаваньне калгасу. Ніякай дапамогі калгас ад іх ня мае. Калі ў самым хуткім часе ня будзе зьвернута ўвага на калгас, ня будуць прыняты самыя рашучыя меры для наладжваньня працдысцыпліны ў калгасе, палова сенажаці застанецца ня ўбранай.

Ракіта.

Там, дзе адсутнічае зьдзельшчына, сацспаборніцтва і ўдарніцтва

20 ліпеня скончыўся кантрольны тэрмін сенаўборкі, вызначаны Наркамземам, а калгас «Ленінскі Луч» (Расонскі раён, Гарбачоўскі сельсавет) толькі зараз прыступіў да сенаўборкі. У калгасе да гэтага часу яшчэ ня ўведзена зьдзельшчына, няма правільнай расстаноўкі рабочай сілы, сацспаборніцтва і ўдарніцтва разгорнуты слаба. Яшчэ да гэтага часу не ўзараны



Калгасьніца Науменко, лепшая ўдарніца, за работай на конных граблях. (Калгас імя Леніна)

папар пад азімыя культуры. Калгасьнікі ня маюць на руках працоўных кніжак. Ужо ў раёне пачалася ўборка збожжа, а наш калгас яшчэ зусім не падрыхтаваўся да яе. Належным арганізацыям трэба прыняць суровыя меры да праўленьня калгасу «Ленінскі Луч», каб яно як сьлед узялося за работу і бальшавіцкімі тэмпамі ў рабоце, арганізацыяй сацспаборніцтва, ударніцтва, увядзеньнем зьдзельшчыны, правільным вучотам работы ў працаднёх, правільнай расстаноўкай рабочай сілы хутчэй мабілізавала масы калгасьнікаў па ліквідацыі прарываў.

Калгасьнік.

У Бабруйскім раёне толькі 20 проц. убрана сенажацяй

Злачынна марудна праходзіць сенаўборка ў Бабруйскім раёне. Па апошніх зьвестках плян сенаўборкі па раёне выкананы толькі на 20 проц. Калі з боку раённых арганізацый ня будуць прыняты тэрміновыя і рашучыя меры, дык уборка сена будзе сарвана.

Праўда, шмат якія калгасы паказалі сапраўды высокія тэмпы работы. Напрыклад калгасы «Першага Мая», «Пчолка», «Бальшавік» ужо скончылі сенаўборку. Убіраючы сена яны не забыліся падрыхтаваць да сустрэчы ўборкі ўраджаю: адрамантавалі ўсе ўборачныя машыны, калёсы і іншы дробны ўборачны інвэнтар.

Каб скончыць у тэрмін сенаўборку, калгасьнікі калгасу «Бальшавік» адмовіліся ад выхадных дзён. Некаторыя саўгасы, як Жылічы і Дзейнічава за некалькі дзён да тэрміну скончылі сенаўборку. У гэтых саўгасах добра пастаўлена працоўная дысцыпліна. На сенажацях паміж рабочымі брыгадамі было шырока разгорнута ўдарніцтва і сацспаборніцтва.

У перадавых калгасы, якія добра справіліся з уборкай сена і падрыхтаваліся да ўборкі збожжа, пачаўся масавы прыліў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Ударныя прыклады баявой работы ў гэтых калгасах павінны быць перанятыя астатнімі калгасамі ў раёне з тым, каб у самы бліжэйшы час скончыць уборку сена і пераключыцца на ўборку новага ўраджаю.

А. Забалотны.

Зьдзельшчына выклікала хвалю сац-спаборніцтва і ўдарніцтва

Калгас імя Войкава, Зубаўскага с.-с., Копыскага раёну, усю работу перавёў на зьдзельшчыну, усе калгасьнікі разьбіты па брыгадах.

З пераходам на зьдзельшчыну ў калгасьнікаў зьявілася вялікая зацікаўленасьць да работы, пачало разгортвацца сацспаборніцтва і ўдарніцтва, як паміж брыгадамі, так і паасобнымі калгасьнікамі.

Мігдалёў.

Трава ад поліва марна гіне

Раньняе сіласаваньне па Ўраравіцкім раёне сарвана

Па калгасах Ураравіцкага раёну плян раньняга сіласаваньня сарваны. Рад калгасаў яшчэ не прыступіў да сіласаваньня кармоў. Буйнейшы калгас імя Энгельса праяўляе злачынную нядбайнасьць у галіне стварэньня моцнай кармовай базы. У сувязі з праполкай лёну і гародаў ёсьць шмат пустазельля, якое можна было-б засіляваць і атрымаць значную колькасьць сілосу, але праўленьне калгасу аб гэтым не клапоціцца.

Таксама нічога ня робіцца па дагляду за сілосными культурамі. Калгас імя Энгельса мае 18 га пасеву кукурузы, але апошняя зарасла травой. Ня прымаюцца захады, каб апалоць і абагнаць кукурузу.

Ня лепш абстаіць справа з сіласаваньнем і па іншых калгасах Ураравіцкага раёну—імя Варашылава, «Камінтэрн», імя Чангарскай дывізіі, імя Леніна і інш., дзе аб сіласаваньні кармоў зусім ня думаюць. Толькі калгас «Дружба» засіласаваў некалькі тон зялёніны.

Таксама нічога ня робіцца па будаўніцтве сілосных установак. У калгасе імя Энгельса сілосныя вежы будуюцца другі год, ніхто дакладна ня ведае, калі будзе закончана пабудова і рамантаваньне сілосных установак.

Ураравіцкія раённыя арганізацыі павінны зьвярнуць сур'ёзную ўвагу на правядзеньне сілоснай кампаніі. Да 1-га жніўня трэба дабіцца выкананьня пляну сіласаваньня ня менш як на 30 проц.

Цэт.

На гастролі ў Вільню

Вядомы кат Луцкай дэфэнзывы. Начальнік III-аддзелу Шафранскі, пераехаў у Вільню на такую-ж пасаду. (З газет).

Імпэрыялістычныя драпежнікі Францыі, Англіі і Амэрыкі

вядуць барацьбу за свае выгады ў „выратаваньні" Нямеччыны

Пазыцыя Францыі застаецца нязьменнай

ЛЁНДАН, 22-7. Спробы фінансавай камісіі, якая ўключае міністраў фінансаў, а таксама Брунінга і Макдональда, знайсьці адзінае рашэньне аказаліся дарэмнымі. З прычыны гэтага на сёньняшнім пленэрным паседжаньні канфэрэнцыі фігуруе некалькі праектаў фінансавай дапамогі Нямеччыне. Пазыцыя Францыі застаецца нязьменнай, Францыя выказваецца за доўгатэрміновую пазыку, забясьпечаную кантролем над мытнымі даходамі ў Нямеччыне і іншымі гарантыямі..

Пазыцыя ПАЗШ зводзіцца да таго, што канфэрэнцыя не павінна вырашаць агульную праблему нямецкіх фінансаў, а павінна абмежавацца такімі мерапрыемствамі, якія далі-б магчымасьць Нямеччыне некалькі палепшыць свае фінансавае становішча. Стымсон лічыць, што галоўная задача канфэрэнцыі заключаецца ў тым, каб прыпыніць далейшую ўцечку сродкаў з нямецкіх банкаў і пабудзіць дзяржавы да спыненьня патрабаваньняў сваіх доўгатэрміновых крэдытаў.

Можна лічыць, што праект доўгатэрміновай пазыкі, які абараняецца Францыяй, адпадаюць. У сувязі з гэтым, паўстае пытаньне аб удзеле Францыі ў кароткатэрміновых крэдытах. У колах канфэрэнцыі ўсё больш лічацца з фактам, што Францыя адмовіцца ўдзельнічаць у кароткатэрміновых крэдытах, якія не дазваляюць ёй настойваць на значнай палітычнай кампэнсацыі. Лічыцца зусім магчымым, што Англія і ПАЗШ будуць у далейшым дзейнічаць апроч Францыі.

ПАРЫЖ, 23-7. Агэнцтва Гавас паведамляе: «На Лёнданскай канфэрэнцыі ангельскі міністр фінансаў Сноўдэн настоіваў на тым, каб у склад анкетнай камісіі, накіроўваемай у Нямеччыну ўвайшлі дагаворы камісійных банкаў Англіі, Францыі і ПАЗШ.

Аднак, па прапанове Лаваля, назначэньне членаў камісіі было прадастаўлена банку міжнародных разьлікаў. Такольки анкетная камісія будзе вывучаць магчымасьць канвэрсіі часткі кароткатэрміновых крэдытаў у крэдыты доўгатэрміновыя і, тым самым, магчымасьць прадастаўленьня Нямеччыне пазыкі, камісія вернецца да французкай прапановы.

Таму Лаваль лічыць патрэбным ужо зараз кадладна вызначыць пазыцыю французкага ўраду: якія-б ня былі заключэньні анкетнай камісіі, адказныя ўрады захоўваюць поўную свабоду ў справе таго ці іншага іх скарыстаньня.

Рэвалюцыйныя падзеі ў Гішпаніі нарастаюць

У правінцыях Андалузія і Сэвільля абвешчана ваеннае становішча. Вулічныя бойкі рабочых з паліцыяй у буйнейшых прамысловых цэнтрах ня спыняюцца

ПАРЫЖ, 23-7. Весткі, якія паступаюць з Гішпаніі, гавораць аб вельмі напружаным становішчы ў краіне, асабліва ў правінцыях Андалузія і Сэвільля.

Паводле слоў «Эр Нувэль», якая выдаецца ў Парыжы, гішпанскі ўрад аддаў распараджэньне аб закрыцьці ва ўсёй Гішпаніі камуністычных і анархасындыкалісцкіх арганізацый. Паводле апісаньня корэспандэнта Гавас, учора ў Сэвільлі з поўдня ў розных кварталах гораду ня спынялося сутычкі паміж рабочымі і грамадзянскай гвардыяй. Сутычкі справаждаліся перастрэлкай. Колькасьць параненых вельмі значная. Да вечара вялікая група дэманстрантаў, на чале якой было шмат жанчын, спрабавала аўладаць казармам грамадзянскай гвардыі. Пры пачаўшайся перастрэлцы цяжка паранены 4 асобы. Колькасьць арыштаваных—звыш 600 чал. З-за недахопу месца ў турме, арыштаваных сажаюць у сутарэньне гарадзкога муніцыпалітэту. Памяшканьне кампартыі апячатана. Захоплены ў часе паседжаньня члены камітэту кампартыі арыштаваны.

Паводле паведамленьня французкага друку, Сэвільля прадстаўляе малюнак акупаванага вайсковымі сіламі гораду: па вуліцах расстаўлены кулямётныя часьці, артылерыя, прахожых прымушаюць падымаць рукі ўгару—ідзе праверка дакумэнтаў; «падазроных» арыштоўваюць. Над горадам лятаюць выведчыя аэрапланы. Улада папярэдзіла, што тыя, хто здымаюць і ўласьнікі кватэр, з якіх будуць страляць, будуць разглядацца як удзельнікі страляючых. У рабочых прыгарадах адбываюцца масавыя вобыскі—шукаюць удзельнікаў паўстаньня. Позна ўвечары абвешчана асаднае становішча. Разьязджаючыя па горадзе ў аўтамабілях кулямётчыкі атрымалі загад страляць па ўсякай «падазронай» групцы людзей. У многіх мясцовасьцях правінцыі Сэвільля адбываліся выступленьні. Учынена шмат арыштаў. Есьць параненыя. Аналягічная сутычка адбылася ў Кадыксе, дзе рознымі чынам, некалькі чалавек паранены. Памяшканьні рэвалюцыйных рабочых арганізацый у Мадрыдзе зачынены.

„Бальшавізм не затрымаецца ля мяжы Нямеччыны"

Цьвярозае прызнаньне ворага

БЭРЛІН, 23-7. Лідэр нямецкіх нацыяналістаў Гугенбэрг апублікаваў у амэрыканскім друку наступную заяву: «па сканчэньні гувэрскага мараторыя павінна быць нямінуча пастаўлена пытаньне аб рэвізіі рэпарацыйных плацяжоў. Нямеччына стаіць на раздарожжы: або моцны, здаровы, уцелясьняючы нацыянальныя сілы ўрад, або бальшавізм. Аднак бальшавізм не затрымаецца ля межаў Нямеччыны».

Катастрафічны гураган над Люблінам

ВАРШАВА. 22-VII. «Газэта Варшавска» пад загалоўкам «Цыклён над Люблінам» друкуе наступную заметку аб катастрафічным гурагане ў Люблінскім ваяводзтве:

«Вялікі гураган прайшоў гэтымі днямі над Люблінам, які прычыніў у горадзе калёсальныя шкоды. Завіруха пачалася вечарам. Разам з віхрам пайшоў вялікі лівень. Сіла віхру была такая вялікая, што абвалвала людзей з ног. Гарадзкі аўтобус быў павалены гураганам на камяніцу з такой сілай, што быў зусім разьбіты, а пасажыры цяжка паранены. На станцыі віхар вывярнуў некалькі вагонаў, з якіх 3 былі з коньмі. На станцыі ў выніку гурагану параненя 13 асоб. Па горадзе гураган забіў двух звозчыкаў і аднаго паліцыянта. Адзін са звозчыкаў Ёсэк Бэргман быў захоплены ветрам з козлаў і кінуты аб камяніцу з такой сілай, што забіўся на месцы.

«Сярод сьвісту ветру валіліся на вуліцы шыбы, вакенныя рамы, дрэвы, камины, даху і сьцены. Зусім вышчаны Бранавіцкі парк. Частка вывернутых з карэньнямі дрэў была вынесена віхрам. Такі-ж лёс спаткаў і тэлеграфныя слупы. Рабочы пасёлак недалёка ад Бранавіцкага парку застаўся зусім бяз даху.

«Некалькі тысяч засталося бяз даху над галавой. Амаль усе будынкі зруйнаваны. 150 чалавек параненых і 6 забітых.

«Аб вельмі вялікіх стратах ад гурагану паведамляюць з усіх ваколіц пад Люблінам,—у вёсках і маёнтках».

Тысячы працоўных панярпелі вялікія страты, тысячы сем'яў рабочых і бядняцка-серадняцкіх мас застануцца бяз хлеба і хат. Не падлягае сумненьню што фашысцкі ўрад ня дасьць ні граша панярпеўшым ад навальніцы. Мы ўжо паведамлялі, што такая зьнішчальная навальніца адбылася ў Віленскім і Навагрудзкім ваяводзтвах. Страты выражаюцца ў тысячах гектараў зьнішчанага градам засеву, у сотнях выпадкаў пажараў. На дапамогу ад фашысцкага ўраду, які трацілі на падрыхтоўку крыжавога паходу супроць СССР больш паловы ўсіх дзяржаўных выдаткаў, працоўныя масы, панярпеўшыя ад навальніцы ня могуць чакаць і не чакаюць. Над панярпеўшымі ад навальніцы навісла здань голаду.

Заслужаны артыст з Луцку

Вядомы кат Луцкай дэфэнзывы. Начальнік III-аддзелу Шафранскі, пераехаў у Вільню на такую-ж пасаду. (З газет).

На гастролі ў Вільню

Напярэдадні 1-га жніўня—дню барацьбы супроць імпэрыялістычных войн

У Баўгарыі

Баявыя дэманстрацыі пад лёзунгам абароны СССР

ВЕНА. 23-VII. Паводле паведамленьня з Сафіі, учора на ўсёй Баўгарыі адбыліся баявыя рабочыя дэманстрацыі, якія прайшлі паводле ацэнкі буржуазнага друку, пад знакам генэральнай рэпэтыцыі міжнароднага антываеннага дня.

Скліканы ўчора рабочай (рэвалюцыйнай) партыяй, наперакор паліцэйскай забароне, у цэнтры Сафіі масавы мітынг закончыўся жорсткімі сутычкамі з паліцыяй. Больш 200 дэманстрантаў у тым ліку 2 дэпутаты парляманту ад рабочай партыі, паліцыяй арыштаваны.

У Ямболе, дзе адбываецца забастоўка тэкстыльшчыкаў, дэманстранты штурмавалі турму, спрабуючы вызваліць зьняволеных камуністаў. Падасьпеўшыя на дапамогу турэмнай варце вайсковыя часьці далі рад залпаў па дэманстрантах, якія ў адказ накінуліся на салдат з градам каменьняў.

У Варнагдзе, дзе таксама ідзе забастоўка тэкстыльшчыкаў, дэманстрацыя справаждалася крывавымі сутычкамі з паліцыяй і стрэламі, як з боку паліцыі, так і з боку рабочых. Міністр унутраных хспраў Ўранаў у гутарцы з журналістамі заявіў, што ўрад пагражае бязлітаснымі мерамі забараніць далейшыя выступленьні камуністаў.

У Румыніі

ВЕНА, 23-7. Водлуг паведамленьня з Румыніі, бухарэсцкая акрэўка арыштавала 20 чалавек па абвінавачаньні ў падрыхтоўцы да антываеннага дня—1-га жніўня. Сярод іх дэпутата румынскага парляманту ад рабоча-сялянскага блёку Аладара.

ВЕНА, 23-7. Паводле паведамленьня з Румыніі, група бухарэсцкіх інтэлігентаў, якая прымала актыўны ўдзел у выбарчай кампаніі рабоча-сялянскага блёку, ужыла крокі па стварэньні саюзу прыяцеляў СССР.

У бой за торф.

Дзённае заданьне 7642 тоны

Зводка

выкананьня пляну здабычы торфу на торфазаводах БССР за 20 ліпеня 1931 г.

1. «Ленінскі Шлях» — 101,2
2. «Чырвоны тарфянік» — 96,5
3. «Міханавічы» — 83,5
4. «Чырвоны Кастрычнік» — 76,3
5. «Даўмана» — 72,0
6. «Новая Беларусь»—68,9
7. «Закрашынскі мох» — 48,9
8. «Грэбяцёва» — 48,1
9. «Шлях сацыялізму» — 45,4
10. «Чырвоны Сьцяг» — 44,4
11. «Бальшавік» — 39,0
12. «Зьвязда» — 36,9
13. «Асінторф» — 35,5
14. «Чырвоная Бел.» — 14,6
15. «Вялікі Мох» — 9,5

Крывая па торфазда бычы дзенных заданняў ідзе ўніз

Калі на 15 ліпеня 1931 г. крывая дзеннага заданьня па здабычы торфу ў БССР дасягнула 52,8 проц., дык на 19 ліпеня 1931 г. дзённая крывая торфаздабычы зьехала.. на 28,9 проц.

Характарна тут тое, што крывая зьходзіла кожны дзень па спадаючых ступенях.

Гэтыя лічбы гавораць за тое, што справа здабываньня торфу яшчэ ня стала справаю сумленьня і гонару.

Горскі сельсавет ня лічыць патрэбным мабілізаваць на торфараспрацоўкі як калгасьнікаў, так і аднаасобных сэк тар. Гэты сельсавет зусім ня цікавіцца торфаздабываньнем.

На Асінторфе яшчэ і да гэтага часу не паклапаціліся, каб забясьпечыць поўнасьцю гаспадарчым, партыйным і прафсаюзным кіраўніцтвам, у чым і тоіцца галоўная прычына прарыву па торфаздабычы. На торфараспрацоўках Асінторфу панцуе абязьлічка.

Т. А.

Пачалася справаздачная кампанія Менскага гарсавету

Работу гарадзкога савету пад крытыку мас!

Мабілізаваць грамадзкую думку вакол рашучай перабудовы ўсёй работы гарадзкога савету, ажыўленьня работы сэкцый і дэпутацкіх груп

Ніводнага выбаршчыка па-за справаздачным сходам гарадзкога савету!

Менгарсавет пачынае справаздачную кампанію

Пад агонь бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі работу саветаў

Вялізарныя задачы сацыялістычнага будаўніцтва патрабуюць чоткай работы ад усіх зьвеньняў савецкага апарату, карэннай перабудовы ўсёй работы і ў першую чаргу гарсавету.

Справаздачная кампанія гарсавету павінна выявіць, як савет у сапраўднасьці перабудаваў сваю работу ў адпаведнасьці з дырэктывамі партыі і наказам выбаршчыкаў.

З усёй бальшавіцкай рашучасьцю неабходна ўзяць пад абстрэл работу гарсавету па кіраўніцтву прамысловасьцю гораду. Гарсавет у гэтай галіне работы мае значныя дасягненьні, але побач з дасягненьнямі ёсьць і недахопы. Лічбы выкананьня прамфінпляну як па колькасных (86 проц.), так і па якасных паказьніках сьведчаць аб прарыве на гэтым важнейшым вучастку сацыялістычнага будаўніцтва, сыгналізуючы аб тым, што ня ўсё зроблена для таго, каб забясьпечыць выкананьне пляну 3-га рашаючага году пяцігодкі. Асобныя перабоі ў забесьпячэньні заводаў сыравінай не даюць права рабіць вывад, што пляны нерэальныя. Мы маем усе магчымасьці для выкананьня пляну. Аб гэтым яскрава сьведчыць перавыкананьне прамфінпляну за першае паўгодзьдзе радам прадпрыемстваў («Бальшавік», шорна-галянтарэйная і інш.).

Пракладка новых тратуараў (Менск).

Наяўнасьць абязьлічкі ў кіраўніцтве, нерашучае правядзеньне гаспадарчага разьліку, ураўнілаўка, самацёк па асобных прадпрыемствах ў падыхтоўцы кваліфікаванай рабсілы, няўменьне расставіць сілы і стаць на чале энтузіязму рабочых — вось прычыны прарыву. Усё гэта справаздачная кампанія павінна ўскрыць і мабілізаваць масу на ліквідацыю прарыву.

Гарсаветам прароблена вялікая работа ў справе правядзеньня другой бальшавіцкай сяўбы. Дырэктыва партыі і наказ выбаршчыкаў аб калектывізацыі ў час веснавой сяўбы ня менш 65 пр. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак раёну — перавыканана. Калектывізавана 67 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Бальшавіцкая падрыхтоўка і правядзеньне ўборкі і асеньняй сяўбы павінна забясьпечыць завяршэньне сацыяльнай калектывізацыі прыгараднага раёну і на яе аснове ліквідацыю кулацтва, як клясы. Аднак выкананьне 92,3 проц. пляну сяўбы зьяўляецца не адвальняючым. Калі прароблена вялікая работа ў справе спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі (садова-гароднай, жывёлагадоўчай і інш.) з мэтай поўнага забесьпячэньня працоўных гораду гароднінай і малочнымі прадуктамі, дык падрыхтоўка да ўборкі ўраджаю і асабліва праполка праходзяць незадавальняюча. Галоўная прычына гэтага — непераход шмат якіх калгасаў на зьдзельшчыну, нездавальняючая працыцыпліна, прагулы і г. д. Мабілізацыя калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі вакол гэтых пытаньняў у час справаздачнай кампаніі — адна з галоўных задач.

Справаздачная кампанія гарсавету павінна значную ўвагу зьвярнуць на пытаньне камунальнай гаспадаркі, на палепшаньне дабрабыту працоўных гораду. Ня гледзячы на тое, што наказ выбаршчыкаў у гэтым напрамку частова выконваецца (пабудова лазьні, высяленьне з камунальных кватэр непрацоўнага элемэнту і засяленьне рабочымі, пабудова купальні, пабудова парку адпачынку і г. д.), тэмпы ўпраджаваньня камунальнай гаспадаркі, палепшаньня дабрабыту ўсё-ж нельга прызнаць дастатковымі. Надзвычайна слаба праходзіць жыльлёвае будаўніцтва, брукаваньне вуліц, тратуараў, рамонт жылых памяшканьняў і г. д. Зусім не распачаты работы па пабудове новай трамвайнай лініі. Усе гэтыя задачы павінны мабілізаваць грамадзкасьць вакол іх выкананьня.

Гістарычная адозва ЦК УсеКП(б) і СНК СССР абавязалі каапэрацыю, асабліва спажывецкую, рашуча перабудаваць сваю работу. Што ў гэтым напрамку зрабіў гарсавет? Трэба адзначыць, што ня ўсё зроблена для таго, каб гэту важнейшую дырэктыву партыі і ўраду і наказ выбаршчыкаў выканаць. Грамадзкае харчаваньне, асабліва палепшаньне якасьці абедаў, зьнішчэньне чаргі ў крамах, набліжэньне крам да спажыўца і г. д.—усё яшчэ застаюцца нездавальняючымі. Надзвычайна дрэнна абстаіць справа з забесьпячэньнем гораду дровамі і прадпрыемствам торфам. Мабілізацыя членаў гарсавету, рабочых на лесазагатоўкі і торфараспрацоўкі, арганізацыя рабочых дружын яшчэ не забясьпечыла на лежнага пералому. Патрэбна шырокая мабілізацыя працоўных на ліквідацыю драўнянага крызісу і тарфянага прарыву. Гэтага трэба дабіцца, чаго-б гэта ні каштавала.

Вялікія посьпехі дасягнуты і ў нацыянальна-культурным будаўніцтве ў БССР, дзякуючы правядзеньню правільнай нацыянальнай палітыкі, пад кіраўніцтвам КП(б)Б.

Гарсавет у сваёй рабоце праводзіць рашучую барацьбу, з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай, і нацдэмакратызмам і шавінізмам розных колераў. Праведзены месячнік генэральнай праверкі беларусізацыі выявіў у радзе ўстаноў наяўнасьць скажэньня ленінскай нацыянальнай палітыкі. Выяўлены факты злоснага нежаданьня вывучаць беларускую мову, шавіністычных настрояў і г. д. Рашучая барацьба з гэтым, ачышчэньне апарату ад клясава-чужых элемэнтаў—адна з важнейшых задач савету, усёй пралетарскай грамадзкасьці.

Разгортваньне сацыялістычнага будаўніцтва патрабуе ад саветаў, як органаў дыктатуры пралетарыяту, рашучага павароту тварам да вытворчасьці, карэнай перабудовы работы на падставе шырокага разгортваньня масавай работы савету, прыцягненьне шырокіх колаў рабочых да работы савету.

Як гэту задачу выконвае Савет?

Арганізацыя на асобных прадпрыемствах дэпутацкіх (савецкіх) груп, прыцягненьне да рбаоты дэпутацкай групы да 70 чал. рабочага актыву («Бальшавік», «Камунар», абутковая фабрыка), канкрэтная барацьба і мабілізацыя масы вакол выкананьня прамфінпляну —лепшыя прыклады правільнага разгортваньня масавай работы.

Аднак на большасьці прадпрыемстваў дэпутацкія групы вусім слаба разгарнулі работу, а паасобныя вусім бязьдзейнічаюць. Узьняць на прынцыпова палітычную вышыню значэньне разгортваньня масавай работы савету (дэпут. групы, сэкцыі) — гэта адна з галоўных задач справаздачнай кампаніі.

Правядзем справаздачную кампанію пад лёзунгам: пад агонь бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі работу гарсавету, за рашучую ліквідацыю прарываў, за безадкладную перабудову работы савету. Праверым работу кожнага дэпутата савету.

Усе 100 проц. выбаршчыкаў на справаздачныя сходы.

А. Шалкавец.

Сельская гаспадарка Менскага раёну да справаздачнай кампаніі гарсавету

Менскі Гарадзкі Савет за справаздачны пэрыяд, пад кіраўніцтвам партарганізацыі, дабіўся значных посьпехаў у галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі раёну.

Дырэктыва лютаўскага пленуму Гаркому КП(б)Б каб у веснавую сяўбу г.г. калектывізаваць ня менш 60 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак раёну ня толькі выканана, але і перавыкананa. На 1-га ліпеня калгасамі ахоплена 65,9 проц. усіх гаспадарак, прычым такія сельсаветы як Прыгарадны, Строчыцкі, Трасьцянецкі, Гарадзецкі, Сеніцкі, Папярнянскі, Грычанскі, Ратамскі і Новадворскі дасягнулі ад 75 да 95 проц. калектывізацыі і заканчваюць суцэльную калектывізацыю сваіх сельскіх саветаў.

У раёне ёсьць 24 саўгасы, якія займаюць 12.509 га пахаці або 17,8 проц. усёй пахатнай плошчы раёну. У гэтым годзе плошча пад саўгасамі была пашырана на 1.525 га і цяпер праводзіцца работа па пашырэньні іх плошчы яшчэ на 3.000 га.

Веснавая сяўба

Плян веснавой сяўбы 1931 г., які быў зацьверджаны Менгарсаветам, прадугледжваў забесьпячэньне працоўных гораду гароднінай і бульбай і значнае месца адводзіў стварэньню кармавой базы, каб забясьпечыць разьвіцьцё сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Згодна гэтага пляну трэба было пасеяць рознымі яравымі культурамі 44.641 га.

Але ня гледзячы на поўную рэальнасьць гэтага пляну і на наяўнасьць у раёне МТС плян веснавой сяўбы выканан толькі на 93,2 проц. Асабліва значны прарыў маецца ў пасеве тэхнічных культур—плян на якіх выкананa на 73,5 проц., кораньплодаў—на 61,7 проц., бульбы—на 84,3, гароднай культуры—83,3 проц., і зусім праваленны плян пасеву аднагадовых траў, плян па якіх выкананы на 43,1 проц.

Прычыны гэтых буйнейшых прарываў крыюцца ў тым, што рад сельсаветаў як Грычынскі, Сеніцкі, Строчынскі і Калодзішчанскі, а таксама рад калгасаў праявілі поўную бязьдзейнасьць у справе мабілізацыі насенных фондаў, у выніку чаго некаторыя калгасы ня мелі насеньня. Адсутнасьць належнай работы сярод новых калгасьнікаў па абагульваньні іх сродкаў вытворчасьці прывяла да таго, што ў калгасах не хапала інвэнтару.

Земчастка Гарсавету, Райкалгассаюз і Райкаапсаюз вельмі дрэнна кіравалі ходам сяўбы. Калгасы і асабліва адна асобны сэктар былі прадастаўлены самі сабе. У некаторых калгасах меў месца сыстэматычны нявыхад на работу калгасьнікаў. Зьдзельшчына таксам ня была ўжыта ў часе сяўбы.

Машына-трактарная станцыя

У красавіку месяцы ў раёне была арганізавана МТС з 31 трактара. З прычыны позьняй арганізацыі і таму, што Менгарсавет не паклапаціўся аб своячасовым забесьпячэньні МТС адпаведнымі кадрамі камплектаваньне яе неабходнымі работнікамі праходзіла ў часе разгару сяўбы, што вельмі адмоўна адбілася на выкананьні пасеўных плянаў.

Для падрыхтоўкі рулявых былі арганізаваны курсы, праз якія прапушчана 89 чал. калгасьнікаў. Гэтыя рулявыя і цяпер працуюць на трактарах.

МТС заключыла 30 дагавароў з калгасамі. Плян сяўбы МТС выканала на 99 проц. але трэба адзначыць, што плян быў выканан за кошт пасеву збожжавых культур пры значным недавыкананьні пляну тэхнічных культур, гародаў і асабліва аднагадовых кармовых траў. Загрузка трактароў у часе сяўбы была далёка непоўная. Былі частыя прастоі з-за паломак, нераспарадчасьці, з-за існаваўшай абязьлічкі і т. д. Цяпер МТС разгарнула работу па падрыхтоўцы да ўборкі ўраджаю і асеньняй сяўбы. Праводзіцца рамонт трактараў і прычэпных машын, праведзены курсы калгасьнікаў па падрыхтоўцы да работы на складаных уборачных машынах. Праведзены вытворчыя нарады ў калгасах, сярод трактарыстаў і ўсіх работнікаў МТС.

Аднак трэба з усёй рашучасьцю падкрэсьліць, што Менскі раён усё-ж да ўборачнай кампаніі і асеньняй сяўбы як належыць не падрыхтаваўся, што можа прывесьці да падтарэньня прарываў вясеньняй пасеўнай кампаніі.

На зьдзельшчыну перашла вызначная колькасьць калгасаў, вучот працы пастаўлен вельмі дрэнна, рамонт інвэнтара праведзены далёка ня ўсюды. Варты ўвагі той факт, што ў справаздачных матар'ялах Гарсавету няма ніводнага слова аб усіх гэтых пытаньнях (за выключэньнем МТС). Гэта тлумачыцца тым, што Гарсавет вельмі мала ведае становішча гэтай важнейшай галіны работы, што выяўляецца буйнейшым недахопам работы Гарсавету, які павінен быць неадкладна выпраўлены.

Малочная гаспадарка

У галіне разьвіцьця малочнай гаспадаркі Менскі Гарсавет мае рад дасягненьняў. Дастаткова прывесьці адзін факт, які характарызуе рост гэтай галіны гаспадаркі. На 1-га ліпеня 1930 г. на Менскі малаказавод паступала 20.000 літраў малака ў дзень, а на 1-га ліпеня 1931 г. у сярэднім паступае 30-35 тысяч літраў. Ёсьць значны рост малочных фэрм у калгасах, саўгасах і гаспадарках МЦРК.

Аднак трэба прызнаць, што ў гэтай галіне зроблена яшчэ вельмі мала. Плян укамплектаваньня фэрм ня выконваецца. Яшчэ ня вырашана пытаньне адносна гадоўлі маладняка ды інш. Усе гэтыя пытаньні патрабуюць неадкладнага вырашэньня з боку Гарсавету.

Галоўнае на што павінна быць зараз зьвернута максымум увагі—гэта на пасьняховае правядзеньне ўборачнай кампаніі і на падрыхтоўку да асеньняй сяўбы. На выкананьне гэтых важнейшых задач павінны быць мабілізаваны ўсе сілы і сродкі.

Л. Н—мін.

Задачы дэпутацкіх груп у барацьбе за прамфінплян

«... У адказ інтэрвэнтам гарсавет павінен мабілізаваць масы рабочых і ўсіх працоўных на барацьбу за яшчэ большыя тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва».

«... Гарсавет павінен сапраўды павярнуцца тварам да ўдарніцтва»...

Гэтыя дзьве вытрымкі з наказу дэпутату ў гарсавет ад Менскага Гаркому КП(б)Б зусім яскрава высоўваюць дэпутата, як аднаго з актыўнейшых барацьбітаў за выкананьне прамфінпляну, за будаўніцтва сацыялістычнай прамысловасьці ў Менску наогул. Ад гэтай дырэктывы выцякае рад абавязкаў для ўсіх дэпутатаў, у прыватнасьці, для дэпутацкіх груп гарсавету.

Якое становішча маем мы ў сучасны момант у выкананьні прамфінпляну?

Па рэспубліканскай прамысловасьці

г. Менску прамфінплян першага паўгодзьдзя выканан на 86 проц. Тут відавочны, вялікі прарыў у выкананьні прамфінпляну. Да гэтага трэба дадаць, што прарыў яшчэ ня ліквідуецца, а наадварот, у асобных мясцох паглыбляецца. Так, калі ў маі плян па валавой прадукцыі рэспубліканскай прамысловасьці Менску быў выканан на 85,3 проц., дык у чэрвені ён выкананя усяго на 71,4 проц. Толькі адзінкі, як напр. скурзавод «Бальшавік» (105,5 проц.) выканалі паўгадовы плян. Асабліва недавыканалі прамфінплян заводы «Камунар», імя Варашылава і Ударнік», шклозавод «Пралетары», абутковая, галянтарэйная і шпалерная фабрыкі. Зусім дрэнна прамфінплян выканан па цагельных заводах—на 25 проц. Ня лепш абстаіць справа

па Менскай прамысловасьці Наркамснабу,

дзе прамфінплян першага паўгодзьдзя (па валавой прадукцыі) выканан на 80,5 проц. Па асобных аб'яднаньнях прамфінплян выканан наступным чынам: Белсельпрамаб'яднаньне—72,3 пр., Саюзхлеб—97,4 проц., Белпчацина—106,54 проц. Тут таксама, акрамя Белпчацины, прамфінплян значна недавыкананя. Значна лепш стаіць справа

па мясцовай прамысловасьці Менску,

дзе прамфінплян выканан на 99 проц. (ня ўлічваючы будаўнічых работ, па якіх наглядаецца значны прарыў).

Такое выкананьне прамфінпляну павінна зьвярнуць на сябе ўвагу ўсёй пралетарскай, грамадзкасьці. Тут дэпутацкія групы савету павінны зьяўляцца ініцыятарамі ў мабілізацыі рабочае масы на ліквідацыю прарыву. Дэпутацкія групы паасобных прадпрыемстваў, прыкмячаючы пачатак спаўзаньня ўніз, павінны зараз-жа паставіць пытаньне на прадпрыемстве, у адпаведных сэкцыях гарсавету, а калі трэба, дык і на прэзыдыуме і пленуме гарсавету аб становішчы на даным прадпрыемстве; мабілізаваць пралетарскую грамадзкасьць на ліквідацыю прарыву. Нажаль, такіх фактаў у нас амаль няма.

Барацьба за задавальненьне сыравінай свайго прадпрыемства, барацьба за добраякасныя і колькасныя паказьнікі, за зьніжэньне сабекошту, за падвышэньне прадукцыйнасьці працы—зьяўляюцца першачарговымі задачамі дэпутацкай групы, выкананьне якіх (задач) дасьць магчымасьць ліквідаваць маючыяся прарывы і папярэдзіць іх у дальнейшым.

Дэпутацкая група, калі гэта патрэбна, павінна ставіць у сэкцыях, ці на прэзыдыуме і пленуме гарсавету пытаньне аб дапамозе іншым прадпрыемствам у выкананьні прамфінпляну.

Дэпутацкая група павінна змагацца

за палепшаньне бытавых умоў рабочых свайго прадпрыемства, дабіваючыся палепшаньня ўмоў асабліва ўдарнікаў, асноўных кадраў рабочых свайго прадпрыемства.

Дрэннае выкананьне прамфінпляну па цэлым радзе прадпрыемстваў сьведчыць аб тым, што на гэтых заводах і фабрыках ня была разгорнута масавая работа, ня былі арганізаваны найлепшым чынам сацыялістычныя формы і мэтады працы — сацпаборніцтва, ударніцтва, грамадзкі буксір і інш. Гэта таксама гаворыць за тое, што дэпутацкія групы на даных прадпрыемствах ці не існавалі наогул, ці існавалі толькі на паперы, не праводзячы ніякай масавай работы.

Акрамя таго, цэлы рад задач перад прамысловасьцю высунуты т. Сталіным у яго прамове на нарадзе гаспадарнікаў у чэрвені месяцы. Паколькі члены дэпутацкіх груп зьяўляюцца лепшымі ўдарнікамі на вытворчасьці,—задачай гэтых груп зьяўляецца ажыцьцяўленьне дырэктыў т. Сталіна ў галіне палепшаньня нашай прамысловасьці. Барацьба супроць абязьлічкі, барацьба за гаспадарчы разьлік, пачынаючы ад дырэкцыі і канчаючы варштатам, зьяўляецца адной з асноўных задач дэпутацкай групы.

Апошняе, на чым трэба застанавіцца,—гэта на рабоце дэпутацкіх груп у перабудове ўсёй работы савету, яго сувязі з прадпрыемствам. У дачай справе дэпутацкая група—мост, які зьвязвае савет непасрэдна з вытворчасьцю. Дэпутацкая група павінна зьяўляцца ня толькі «выканаўцам» савету, ня толькі «інфарматарам» аб становішчы на сваім прадпрыемстве, а арганізатарам перамог, арганізатарам сапраўды ўдарнай работы.

Л. Пал.

Менгарсавет не забясьпечыў поўнага выкананьня фінпляну першага паўгодзьдзя

Дэпутацкія групы, сэкцыі, у бой за поўнае выкананьне фінансавых заданьняў

Шпаркія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі, па ўсіх галінах гаспадаркі гораду Менску (капітальнае будаўніцтва, культбудаўніцтва і г. д.) зусім відавочна патрабуюць ад гарсавету максымальнай увагі да мабілізацыі сродкаў. Як Менскі гарадзкі фінансавы аддзел гарсавету выканаў гэтую задачу, як ён змагаўся за выкананьне фінпляну і які ўдзел у гэтай справе прымалі дэпутаты савету, дэпутацкія групы і сэкцыі.

У наказе дэпутату гарсавату

Менгаркому КП(б)Б мы чытаем: «Гарадзкі савет у далейшым павінен:

1. Ліквідаваць да павялічэньня прыбытковай часткі гарадзкога бюджэту шляхам выпушчаньня новых крыніц даходнасьці і спачыць за поўным выкананьнем яго, прыняўшы жорсткія меры да поўнага спагнаньня недоімкі, не дапушчаючы іх у далейшым.

2. Дабіцца 100-процантнага выкананьня кантрольных лічбаў па рэалізацыі прыжаўчнай пазыкі ў горадзе.

3. Палепшыць і ўзмацніць работу кас ашчаднасьці з тым, каб іх работа была прыстасавана да ўцягненьня ўсіх вольных сродкаў насельніцтва:

4. Зьвярнуць асаблівую ўвагу на поўнае і своячасовае атрыманьне 100-проц. паёў усёй каапэрацыйнай сыстэмай».

Што і м зроблена

за першае паўгодзьдзе 1931 году ў гэтай галіне?

Прыбытковая частка бюджэту ўзрасла ў параўнаньні з 1929-30 г. на 65,39 проц., а па ўласных—на 11,30 проц.

Выдаткі ўзрасьлі на 79,96 проц. у параўнаньні з 1929-30 г. На прамысловасьць у 1931 г. выдаткавана 1.035.000 руб. замест 592.700 руб. у 1930 годзе. На камунальную гаспадарку—4.954.000 руб. замест 2.223.000 руб. у 1929-30 г. Узрасьлі таксама выдаткі на культурнае будаўніцтва. На будаўніцтва і рамонт: па нарасьвеце выдаткавана—639.000 руб. і ахове здароўя—88.000 р. Наогул бюджэт Менгарсавету выкананы за першае паўгодзьдзе па ўласных прыбытках на 42,83 проц. гадовай лічбы і на 89,63 проц.—паўгадовы плян.

Што да капітальных укладаньняў у 1931 годзе па Менску, дык прадугледжаная сума ў 6.610.950 руб. у першым паўгодзьдзі выканана толькі на 29,51 проц., альбо на суму ў 1.951.063 руб.

Выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў

першага паўгодзьдзя якое складае 83,3 проц., па паасобных галінах гэта нака таксама дрэнна. Паляпкапленьне па райспажыўсаюзу выканана на 33,8 проц., касавыя паступленьні па рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка» першага зьвароту сярод сялян—на 58,1 проц., сярод рабочых—на 73,5 проц., культзбор на вёсцы—74,8 проц., прампадатак—84,4 проц. (Трэба адзначыць, што выкананьне па прампадатку на 84,4 проц. зьявілася часткова і таму, што вельмі мала было зроблена для таго, каб выкрываць патаемны гандаль). Плян агрыманьня сродкаў праз зварот сельскагаспадарчых пазычак выкананя на 74 проц., уклады ў ашчадкасу—на 77,4 проц., мэтавыя ўклады—вэлёабавязацельствы і швэйныя машыны—на 63 проц.

Дадзенае гораду Менску заданьне па пазыцы «5 у 4» выканана (100,1 проц.), па сельсаветах—195.000 руб., (63 проц), сярод іншага насельніцтва—на 129,3 проц.

Акрамя таго, Менскі Гарфа заключыў сацыялістычны дагавор з Тыфліскім Гарфа і штомесячна абменьваецца вывесткамі аб ходзе работы.

Важнай часткай фінпляну

зьяўляецца ўсялякага роду іншыя падаткі і зборы (аднаразовы збор), прыбытковы падатак, зборы на культбудаўніцтва і інш.), якія ня поўнасьцю спагнаны.

Усё гэта гаворыць за тое, што ў галіне фінансавай работы дэпутацкім групам прадстаіць вялікае поле дзейнасьці, дзе можна і трэба мабілізаваць усю пралетарскую грамадзкасьць на 100-процантнае выкананьне пляну, бо толькі пры поўным выкананьні фінпляну магчыма будзе выканаць усе пляны гаспадарчага і культурнага будаўніцтва гораду.

Але пакуль, што дэпутацкія групы прымаюць вельмі малы ўдзел непасрэдна ў фінансавай рабоце. Між тым, гэта—важная галіна работы ня толькі па горадзе, але непасрэдна на вытворчасьці, на прадпрыемстве.

Дэпутацкія групы

могуць вельмі многа дапамагчы ў выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў, поўным і своячасовым ўзносе паявых укладаў у каапэрацыю, розных зборы (культзборы і і інш.), прампадатак і інш., у зборы мэтавых укладаў у ашчадкасу (вэлё-абавязацельствы і швэйныя машыны)

Асабліва вялікую ролю ў мабілізацыі сродкаў насельніцтва адыгрываюць ашчадкасы, якія ужо маюцца на вельмі многіх буйных прадпрыемствах. Задача дэпутацкай групы—ўсямернае садзейнічаньне, уцягненьне ўкладчыкаў

Ня гледзячы на тое, што намі заданьне па рэалізацыі пазыкі ў асноўным па горадзе выканана, яшчэ ёсьць паасобныя прадпрыемствы, дзе пазыкай поўнасьцю не ахоплены ўсе рабочыя. Дэпутацкая група павінна дамагчыся 100-проц. ахопу ўсіх рабочых пляпіскай на пазыку, растлумачыўшы вялікае гаспадарча-палітычнае значэньне пазыкі «3-га рашаючага году».

Але гэта ня ўсё. Амаль кожнае прадпрыемства шэфствуе над вёскай, калгасам і г. д. ,дзе вельмі мала, асабліва па неабагуленым сэктары, рэалізавана пазыкі. Між тым, гэта адна з найважнейшых і адказьнейшых галін фінансавай работы. Быць ініцыятарамі на сваім прадпрыемстве ў галіне дапамогі падшэфнай вёсцы па распаўсюджваньні пазыкі, самой прымаць актыўны ўдзел (шляхам выезду) у распаўсюджваньні пазыкі на вёсцы—пачэсная задача дэпутатаў савету.

Л. П.

ПАЗЫКУ НА ВЁСЦЫ РЭАЛІЗАВАЦЬ У ТЭРМІН

На 20 ліпеня ў вёсцы рэалізавана толькі 16,6 проц. заданьня. Сярод калгасьнікаў—52,1 проц, сярод аднаасобнікаў—1,5 проц.

Вучыцеся на вопыце калгасаў „Чырвоная Полаччына“ і „Бязбожнік“, камуны „Авангард“ і Бялевіцкага сельсавету, якія перавыканалі заданьне па пазыцы

У штурмавы ўдарны дэкаднік поўнасьцю рэалізаваць пазыку на вёсцы

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

пра рэалізацыю пазыкі „3-га рашаючага году пяцігодкі“ на вёсцы

Выслухаўшы даклад аб рэалізацыі пазыкі «3-га рашаючага году пяцігодкі» на вёсцы, Савет Народных Камісараў БССР адзначае вельмі марудны ход рэалізацыі пазыкі на вёсцы (на 15 ліпеня рэалізавана 1.960 тыс. руб. альбо 12 проц., у калгасах—47 проц., а ў аднаасобным сэктары—0,8 проц.), што пагражае расьцягваньнем кампаніі па рэалізацыі пазыкі.

Раённыя выканаўчыя камітэты і Белкалгасцэнтр да гэтага часу не забясьпечылі сапраўдных бальшавіцкіх тэмпаў рэалізацыі пазыкі сярод калгасьнікаў.

Большасьць раённых выканаўчых камітэтаў недаацэніла ролі аднаасобнага сэктару ў справе рэалізацыі пазыкі.

Бяручы пад увагу паказанае вышэй і неабходнасьць бязумоўнага заканчэньня кампаніі па рэалізацыі пазыкі на вёсцы ў ліпені м-цы, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты недаацаніла ролі аднаасобстаршынь, мабілізаваць усю грамадзкасьць на правядзеньне кампаніі рэалізацыі пазыкі на вёсцы і асабліва сярод індывідуальнага сэктару з тым, каб да 1 жніўня поўнасьцю было выканана заданьне.

2. Даручыць Белкалгасцэнтру зараз-жа даць катэгарычнае паказаньне раённым калгассаюзам увмацніць рэалізацыю пазыкі сярод калгасьнікаў, дабіўшыся поўнага ахопу іх падпіскаю ў разьмеры ня менш трохтыднёвага даходу кожнага калгасьніка, а тым калгасам, якія скончылі ў сябе падпіску, вылучыць ударныя брыгады для правядзеньня рэалізацыі пазыкі сярод індывідуальнага сэктару і адстаючых калгасаў, узяўшы іх на грамадзкі буксір.

3. Адзначаючы поўную бязьдзейнасьць машына-трактарных станцый у справе рэалізацыі пазыкі на вёсцы і накіраваньне належным чынам гэтаю работаю Беларускім Аддзяленьнем Трактарацэнтру, прапанаваць Беларускаму Аддзяленьню Трактарацэнтру ўжыць усе захады да актывізацыі машына-трактарных станцый у справе рэалізацыі пазыкі, дамагаючыся, каб у гэтай рабоце актыўна ўдзельнічалі ўсе работнікі машына - трактарных станцый.

4. Для больш хуткага заканчэньня кампаніі рэалізацыі пазыкі на вёсцы, абвясьціць з 20 ліпеня г. г. штурмавы ўдарны дэкаднік рэалізацыі пазыкі на вёсцы, у сувязі з чым даручыць усім упаўнаважаным цэнтральных устаноў, якія зараз працуюць у раёнах па іншых кампаніях, уключыцца на час ударнага дэкадніка ў работу па рэалізацыі пазыкі. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты мабілізаваць на гэтую работу ўвесь актыў раёну і сельскіх саветаў.

5. Адзначаючы слабае асьвятленьне ў друку ходу кампаніі па рэалізацыі пазыкі, абавязаць цэнтральныя і мясцовыя газэты наладзіць сыстэматычнае асьвятленьне ходу кампаніі рэалізацыі пазыкі на вёсцы, падцягваючы адсталыя раёны і пераносячы прыклады лепшай работы перадавых раёнаў у практыку работы іншых раёнаў.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР К. Бэнэ.
Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР С. Кандыбовіч.
18 ліпеня 1931 г.
г. Менск.

Давесьці ільготы па падатку да ўсіх калгасьнікаў

Усім раённым і гарадзкім фінансавым аддзелам

Па большасьці раёнаў БССР акладныя лісты па сельгаспадатку і страхоўцы ўжо ўручаны платнікам, а па астатніх раёнах гэта праца заканчваецца.

Між тым, па маючыхся ў НКФ весткам, некаторыя раёны не прадаставілі калгасьнікам па іх неабагуленых даходах устаноўленых для іх законам льготы па сельгаспадатку, асабліва тым калгасьнікам, якія ўступілі ў калгасы ў час, альбо пасьля вучоту аб'ектаў сельгаспадатку, чым парушылі заканадаўства Ураду пра сельгаспадатак.

Выходзячы з гэтага, усім калгасьнікам, што ўступілі ў калгасы ў канцы альбо пасьля вучоту аб'ектаў, абагуліўшы маёмасьць у такой меры, як гэта патрабуецца статутам калгасу і дырэктывамі НКЗему і Калгасцэнтру, а падатак ім быў вылічан як аднаасобнікам, на аснове заканадаўства па сельгаспадатку катэгарычна прапаную:

1. Выключыць з абкладаньня ўсе абагуленыя даходы;

2. Выключыць з абкладаньня неаграмаджаную жывёлу;

3. Выключыць з абкладаньня даходы ад продажу прадуктаў на прыватным рынку па падвышаных цэнах;

4. Прадставіць льготы за чырвонаармейцаў і іншых асоб, што пералічаны ў арт. 62, Палажэньня пра сельгаспадатак;

5. Прадставіць льготы за пасевы лёну і канаплі;

6. Цалкам вызваліць ад абкладаньня неабагуленыя даходы тых калгасьнікаў, у якіх адзін або некалькі членаў сям'і закантрактаваліся на работы ў Дзяржаўных і коопэрацыйных арганізацыях;

7. На неаграмаджаныя даходы калгасьнікаў налічыць падатак па паніжанай шкале ставак, зьмешчанай у арт. 25 Палажэньня пра сельгаспадатак.

Гэткія льготы павінны быць безадкладна прадастаўлены ўсім калгасьнікам, якія ўступяць у калгасы да ўборкі ўраджаю.

Народны Камісар Фінансаў БССР А. Хацкевіч.

Уключайцеся ў рапарт-пераклічку

Рэдакцыя «Савецкая Беларусь» і ЦП саюзу фінбанкаўскіх работнікаў праводзяць рапарт—пераклічку аб дзейнасьці РМК ФБР у правядзеньні ўдарнага дэкадніка рэалізацыі пазыкі на вёсцы і правядзеньні іншых палітычна-гаспадарчых мерапрыемстваў.

Асноўныя моманты пераклічкі: як РМК саюзу ФБР здолены па баявому мабілізаваць грамадзкасьць на хутчэйшае і лепшае выкананьне задач пастаўленых ударным дэкаднікам перад кожным РМК саюзу ФБР па рэалізацыі пазыкі на вёсцы. Як РМК арганізавалі грамадзкасьць на выкананьне рашэньняў ліпеньскага Пленуму ЦК КП(б)Б па выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў. Якую дапамогу аказалі РМК па пашырэньні і палепшаньні работы ашчадкас на вёсцы. Як РМК па баявому пераклічыліся на аказаньне практычнай дапамогі Райфа і сельсаветам па правядзеньню кампаніі па сельгаспадатку і страхоўцы і арганізацыі паступленьняў датэрміновых плацяжоў.

На гэтых асноўных момантах РМК фінбанкаўскіх работнікаў павінны паказаць канкрэтныя даныя аб праробленай рабоце.

Пераклічка пачынаецца з 25 ліпеня, ставячы перад сабою задачу—хутчэйшага і лепшага правядзеньня ўдарнага дэкадніка па рэалізацыі пазыкі і правядзеньня іншых палітгаспадарчых мерапрыемстваў, забясьпечваючых выкананьне фінпляну.

Матар'ялы дасылайце рэдакцыі «Савецкая Беларусь» і ЦП саюзу ФБР.

За старшыню ЦП саюзу ФБР Гераўкер.

1.855 р. замест 980 р.

Члены камуны «Авангард», Мазырскага раёну, добра ўявілі сабе ўсю эканамічную і палітычную важнасьць выпуску пазыкі «3-ці рашаючы год пяцігодкі» і замест кантрольнай лічбы на камуну ў 980 руб., падпісаліся на 1.855 руб.

Брыгады «Сав. Бел.» С. Сяргейчык. А. Гундараеў.

Адказ апартуніста

«Заявсеньне гор. Барысава па чорную дошку за нерэалізацыю пазыкі «3-га рашаючага году» ні на адзін рубель закранула нас, бо незерна тое, што да гэтага часу нічога не рэалізавана.

На сёньняшні дзень кантрольнае заданьне па падпісцы на вёсцы выканана на 9 проц. (ці 22.845 руб.), у тым ліку сярод калгаснага сэктару—18.500 рублёў.

Па горадзе падпіска да гэтага часу яшчэ ня скончана. Падпіска праведзена толькі на 87,1 проц. кантрольнага заданьня.

Па неарганізаваным насельніцтве—на 55,6 проц. На вёсцы зараз знаходзіца 29 брыгадзіраў, якія выключна працуюць па гэтай кампаніі.

Заг. райашчадкасы С. Катлоўскі».

АД РЭДАКЦЫІ. У нумары 163 нашай газэты за 18-га ліпеня Барысаўскі раён быў зьмешчаны на чорную дошку за тое, што ён не рэалізаваў на вёсцы ніводнай аблігацыі пазыкі.

Сёньня мы друкуем адказ на гэта загадчыка райашчадкасы тав. С. Катлоўскага, які сам кажа, што пазыка дагэтуль рэалізавана ТОЛЬКІ НА 9 ПРОЦ., што па сутнасьці ня мае вялікай розьніцы ад таго, што нічога не рэалізавана. Тым самым, факт апартуністычнай недаацэнкі распаўсюджваньня пазыкі па вёсцы пацьверджаны самым загадчыкам райашчадкасы.

Калгасы Вушаччыны падпісваюцца на пазыку

Вушачы, (Белта). Наглядаецца шырокае разгортваньне падпіскі ў калгасах. Калгасы «Чырвоная Полаччына» і «Бязбожнік» перавыканалі свае кантрольныя лічбы па 500 руб. Калгас «Зьвязда» падпісаўся на новую пазыку на 300 руб. і выклікаў на сацспаборніцтва калгасы «Будзь гатоў» і «Чырвоны араты», якія выклік прынялі і

Дэкаднік перабудовы іх не закрануў...

ЗРК віцебскіх прадпрыемстваў: „Сьцяг індустрыялізацыі“, „Прафінтэрн“, скурзавод, панчошная ф-ка ня, гледзячы на дэкаднік, сваю работу не перабудавалі. Клічаўская каапэрацыя, замест забесьпячэньня лесарубаў-ударнікаў, забясьпечвае... адказных работнікаў раёну

У дэкаднік не ўключыліся

Згодна пастановы Віцебскага гаркому партыі і гарпрафсавету, ў горадзе з 15 па 25 ліпеня праводзіцца дэкаднік агляду перабудовы работы каапэрацыі.

Праведзеная праверка больш буйных прадпрыемстваў паказвае, што многія партыйныя калектывы і ячэйкі і ФЗМК у дэкаднік праверкі перабудовы работы каапэрацыі яшчэ не ўключыліся. На фабрыцы «Сьцяг індустрыялізацыі», скурзаводзе, панчошнай фабрыцы, камтрэсьце ў гэтай галіне яшчэ нічога ня зроблена і пытаньне ўключэньня ў дэкаднік ня толькі ня ставілася на рабочых сходах, але нават ня ставілася і на пасяджаньнях бюро парткалектываў, ячэек і ФЗМК. Гэта кажа аб тым, што з боку некаторых партыйных і профсаюзных арганізацый на мясцох мы маем апартуністычную недаацэнку перабудовы работы каапэрацыі. Дэпутацкія групы на мясцох, якія павінны былі вярнуць актыўны ўдзел у перабудове работы каапэрацыі, у правядзеньні дэкадніка да гэтага часу таксама яшчэ нічога не зрабілі. Далей працягвацца такое становішча ня можа. Мы павінны зараз мабілізаваць усе партыйныя ячэйкі, ФЗМК, каапактыў на пасьпяховае правядзеньне дэкадніка агляду перабудовы работы каапэрацыі. Праведзімы дэкаднік павінен зьявіцца пераломным у справе правядзеньня ў жыцьцё адозвы ЦК УсеКП(б), СНК і Цэнтрасаюзу аб перабудове работы каапэрацыі.

Н. Дварсон.

Дрэнна абслугоўваюць пайнікаў

Дрэнна абслугоўваюцца пайнікі Віцебскай панчошнай фабрыкі ЗРК. У магазыне № 1 заўсёды вялікія чаргі. Магазын невялікі. Адозва ЦК УсеКП(б), СНК і Цэнтрасаюзу аб пашырэньні гандлёвай сеці ЗРК у жыцьцё не праводзіцца і ў адным невялічкім магазыне сканцэнтравана ўсё: (хлеб, малако, прамтавары і інш.) ЗРК у дэкаднік агляду перабудовы работы каапэрацыі павінен сваю працу перабудаваць так, каб цалкам выканаць адозву ЦК УсеКП(б), СНК і Цэнтрасаюзу.

Брыгады: Шаршнёў («Дзьвіна»). Штукман («Зьвязда»).

Магілеўскі ЦРК пляны ўборачнай захаваў пад сукно

Сельска-гаспадарчы сэктар Магілеўскага ЦРК і да гэтага часу амаль нічога не зрабіў па мабілізацыі мас на ўдарную падрыхтоўку да сустрэчы ўборачнай. Плян уборачнай кампаніі замест таго, каб быць разасланым фэрмам, ляжыць у сельска-гаспадарчым сэктары. Апошні абмежаваўся дасылкай дырэктывы 6 чэрвеня з патрабаваньнем ад фэрм прысылкі пляну гаспадарак, у выніку гэтага на сёньняшні дзень ні ў адной гаспадарцы пляны ўборачай не даведзены да рабочых.

Ня гледзячы на цяжкае становішча з рабочай сілай, сельска-гаспадарчы сэктар амаль нічога не зрабіў па вярбоўцы рабочай сілы. Аб тым, што дрэнна ідзе падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі сьведчыць і той факт, што да гэтага часу сельгасэктарам не праведзен вучот машын, падлягаючых рамонту. На патрэбную колькасьць уборачных машын дадзена заяўка, але на гэтым сельгасэктар супакоіўся. Ніякай работы не праводзіцца па барацьбе са шкоднікамі ўраджаю. Трэба адзначыць і тое, што атрыманыя косы ляжаць да гэтага часу на складзе.

Апартуністычнай недаацэнцы ўборачнай кампаніі павінен быць пакладзены канец. Сельгасэктар Магілеўскага ЦРК павінен неадкладна пераключыцца на баявыя тэмпы падрыхтоўкі да ўборачнай, мабілізаваць рабочыя масы фэрмаў і працоўных гораду на пасьпяховае правядзеньне ўборачнай кампаніі.

Брыгада: Модлін, Шуцікаў.

„Ударная работа“ Клічаўскай каапэрацыі,

або як клічаўскія адказныя работнікі самазабясьпечваюцца

Адным з асноўных элемэнтаў у рабоце спажыўкаапэрацыі на вёсцы зьяўляецца правільны падыход да разьмеркаваньня востра-дэфіцытных тавараў, чоткай і бесьперабойнай дзейнасьці апарату, клясавага падыходу да выдачы тавараў.

Як-жа з гэтым справілася Клічаўская каапэрацыя?

Клічаўскі раён—лесаводны. У гэтым раёне адбываюцца вялікія лесараспрацоўкі. Сюды галоўным чынам накіравана ўвага рабочых Менску па дровазагатоўках. Рабочы Менск, фабрыкі і заводы чакаюць адсюль апалу. У сувязі з гэтым, каапэрацыя мае магчымасьць атрымліваць у значнай колькасьці прамтавары і інш. вострадэфіцытныя тавары з задачай разьмеркаваць іх так, каб рабочы ударнік у лесе атрымліваў іх у першую чаргу.

Што-ж мы маем на справе?

Вакол каапэрацыі згрупавалася амаль усё кіраўніцтва раёну. Тут стварылася нейкая сям'я, якая прысмакталася да каапэрацыі і ў «плячэвым» парадку атрымлівае тавары. Каапэрацыя зрабілася, такім чынам, органам забясьпечаньня раённых работнікаў і толькі адна сотая частка дастагалася спажыўцу рабочаму-ударніку вагласных палёў, рабочым-ударнікам у лесе.

Пройдзем да фактаў. Для рабочых у лесе атрымана 150 пар валёнах. Усяго тры пары накіравана Клічаўскаму леспрамгасу, а астатнія разьдзелены начальству і інш., каб у душных пакоях габінэтаў і канцылярый было лепш сябе адчуваць у цяпле і прыгодзе.

Вялікая колькасьць плашчоў, якая рантам зьявілася ў Клічаве, трапіла ў рукі мясцовых работнікаў, а некаторыя атрымалі па 2-3. Так, тав. Быхаўскі атрымаў 3 шт., пракурор—2 і г. д., бо і ня дзіва, у Быхаўскага 1 жонка, 1 нянька, 1 прыслужніца—трэба-ж ім плашчы даць, а рабочы ў лесе па-Быхаўскаму—пяхай пачакае, у лесе і без плашча добра.

Ягадная пара зьявіла ўвагу кожнага. Варэньне—тэма сур'ёзная. Кожны свой плян імкнецца выканаць з перавыкананьнем. У Клічаве-ж для гэтага ёсьць спрыяючыя ўмовы, бо ягад шмат, а цукру... цукру таксама.

У барацьбе за перавыкананьне пляну, кожны шукае ўсе сродкі, скарыстоўвае ўсе рэсурсы. Гэтую спрытнасьць праявіла гр-ка Быхаўская, якая патрабавала па загаду мужа даць 10 кілё цукру з каапэрацыі сёньня, а заўтра—будзе відна. Калі-ж упарты прыказчык «усумніўся», дык Быхаўская прынесла 5 рэзалюцый «начальства», па якіх можна было выдаць цукру ў 5 разоў больш.

Ды хто ня ведае тут Быхаўскай? Ці толькі ў адным цукры справа? Быхаўская любіць і мяса. Ёй напляваць на тое ,што нехта будзе есьці поснае, абы ў яе, у яе мужа, у ея 2-х работніц страўнікі былі сытымі. Быхаўская ідзе ў краму і патрабуе... 20 кілё мяса. Пры каўбасных арганізацый на мясцох мы маем апартуністычную недаацэнку перабудовы работы каапэрацыі. Дэпутацкія групы на мясцох, якія павінны былі вярнуць актыўны ўдзел у перабудове работы каапэрацыі, у правядзеньні дэкадніка да гэтага часу таксама яшчэ нічога не зрабілі. Далей працягвацца такое становішча ня можа. Мы павінны зараз мабілізаваць усе партыйныя ячэйкі, ФЗМК, каапактыў на пасьпяховае правядзеньне дэкадніка агляду перабудовы работы каапэрацыі. Праведзімы дэкаднік павінен зьявіцца пераломным у справе правядзеньня ў жыцьцё адозвы ЦК УсеКП(б), СНК і Цэнтрасаюзу аб перабудове работы каапэрацыі.

Н. Дварсон.

Магілеўскі ЦРК пляны ўборачнай захаваў пад сукно

Сельска-гаспадарчы сэктар Магілеўскага ЦРК і да гэтага часу амаль нічога не зрабіў па мабілізацыі мас на ўдарную падрыхтоўку да сустрэчы ўборачнай. Плян уборачнай кампаніі замест таго, каб быць разасланым фэрмам, ляжыць у сельска-гаспадарчым сэктары. Апошні абмежаваўся дасылкай дырэктывы 6 чэрвеня з патрабаваньнем ад фэрм прысылкі пляну гаспадарак, у выніку гэтага на сёньняшні дзень ні ў адной гаспадарцы пляны ўборачай не даведзены да рабочых.

Ня гледзячы на цяжкае становішча з рабочай сілай, сельска-гаспадарчы сэктар амаль нічога не зрабіў па вярбоўцы рабочай сілы. Аб тым, што дрэнна ідзе падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі сьведчыць і той факт, што да гэтага часу сельгасэктарам не праведзен вучот машын, падлягаючых рамонту. На патрэбную колькасьць уборачных машын дадзена заяўка, але на гэтым сельгасэктар супакоіўся. Ніякай работы не праводзіцца па барацьбе са шкоднікамі ўраджаю. Трэба адзначыць і тое, што атрыманыя косы ляжаць да гэтага часу на складзе.

Апартуністычнай недаацэнцы ўборачнай кампаніі павінен быць пакладзены канец. Сельгасэктар Магілеўскага ЦРК павінен неадкладна пераключыцца на баявыя тэмпы падрыхтоўкі да ўборачнай, мабілізаваць рабочыя масы фэрмаў і працоўных гораду на пасьпяховае правядзеньне ўборачнай кампаніі.

Брыгада: Модлін, Шуцікаў.

Узор найгоршай каапэрацыйнай работы

У саўгасе Беліца-Відокі (Сененскі раён) ёсьць сельспажыўтаварыства, адзінае на ўвесь Беліцкі сельсавет. Яно мае толькі адну краму. Гэтае сельспажыўтаварыства можа зьяўляцца ўзорным прыкладам найгоршай каапэрацыйнай работы. Яно павінна абслугоўваць Беліцкі сельсавет, рабочых аднаго з буйнейшых у БССР саўгасаў, а таксама каля 250 студэнтаў і курсантаў с-г тэхнікуму і курсаў. Але, ня гледзячы на наяўнасьць такой вялікай масы спажыўцоў, забясьпечаньне рабочых, настаўнікаў, студэнтаў і калгаснікаў зусім дрэннае. Беліцкае спажыўтаварыства ня прымае абсалютна ніякіх захадаў да палепшаньні абслугоўваньня працоўных мас, спадзяючыся на апартуністычны самацёк. Вось факты: паёк, які атрымліваюць рабочыя, уключае ў сябе толькі цукар, хлеб і раз у 3 месяцы асьмушку тытуню. Вось ужо больш 2-х тыдняў, як у каапэратыве няма сярнічак, ды і наогул нічога няма, апроч зубнога парашку, некалькіх летніх шапак і гарэлкі, якая адпускаецца ў дастатковай колькасьці. Абсалютна няма ніякага жаданьня выконваць пастановы партыі і ўраду аб перабудове работы каапэрацыі.

Ня лепш абстаіць справа і ў другіх сельспажыўтаварыствах Сененскага раёну. Ды і ў самым раённым цэнтры ў г. Сянно, дзе таксама панае самацёк, прыкрываемы сказамі аб «таварным голадзе» і нашых цяжкасьцях, на паліцах таксама вельмі цяжка сустрэць кніжку папяросная паперы або штонебудзь падобнае.

Чым-жа можна тлумачыць такую бязьдзейнасьць? Толькі адным—дрэнным кіраўніцтвам, нежаданьнем зрабіць неабходнае для карэннай перабудовы работы каапэрацыі, адрывам вясковага і раённага актыву ад работы каапэрацыі і слабай дапамогай каапэрацыі ў справе рэалізацыі адозвы партыі і ўраду аб перабудове каапэрацыі.

Каапэрацыя не змагла стварыць свой каапактыў і замыкаецца ў рамках праўленьня, а то і зусім аднаго старшыні.

Зараз праводзіцца дэкаднік агляду перабудовы работы каапэрацыі. У гэты дэкаднік усе сельспажыўтаварыствы Сененскага раёну на чале з райспажыўтаварыствам павінны ўзяцца за сапраўдную перабудову сваёй работы, каб выканаць на справе дырэктыву партыі і ўраду.

Л.

Ігрушацкае сельспажыўтаварыства нядбае...

— Калі вы жадаеце ў Ігрушацкім сельспажыўтаварыстве ці ў яго праўленьні дабіцца толку, то ня турбуйцеся, бо ўсё роўна нічога не дабіцецеся...

Так характарызуюць работу сельспажыўтаварыства працаўнікі сельсавету і калгаснікі.

А ўвагі ніхто не зьвяртае на тое, што з вясны сельспажыўтаварыства ні разу не рабіла агульных сходаў пайшчыкаў, што праўленьне сельспажыўтаварыства ні разу не рабіла паседжаньня, што ў бухгалтэрыі сельспажыўтаварыства такая путаніца, у якой цяпер самы лепшы рэвізор не разьбярэцца...

З вонкавага боку сельспажыўтаварыства нібы гандлюе. Але ў Ігрушацкай краме крамнік Вашадок, як зачыніць краму на абед, дык 4 гадзіны, а то і 5 абедае, а калгаснікі ходзяць каля крамы і лічаць Вашадка памешаным... Толькі бяды яму да гэтага мала. Ігрушацкае сельспажыўтаварыства грамадзкімі справамі, апроч гандлю, не займаецца .Таму, калі прадстаўнік РВК зьвярнуўся з пытаньнем аб рэалізацыі пазыкі «3-га рашаючага», то і Вашадок і Шабасоў (старшыня сельспажыўтаварыства) замахалі рукамі ,ды заявілі ,што яны гэтай справай займацца ня будуць, бо ім мала плацяць грошай.

У малочнай, якая належыць сельспажыўтаварыству, створаны сапраўдны трэшчэр з п'янкай і г. д. Толькі ўмяшаньне ячэйкі ЛКСМ направіла гэтую справу.

Ахова і захаваньне тавараў у сельспажыўтаварыстве нікудрышнае. Так, соль часта кідаецца на гнаі ў дзярэ і г. д. Райсаюз работай сельспажыўтаварыства ня цікавіцца.

Я. Крынічны.

Будаўніцтва ў сьвінажывёлагадоўчых саўгасах і МТС пад пагрозай зрыву

На 1-га ліпеня плян будаўніцтва выканан усяго на 10 проц.

Абсьледваньне становішча будаўніцтва ў сьвінажывёлагадоўчых саўгасах і МТС, праведзенае брыгадай Белсельбуду і Саюзсельбуду, выявіла цэлы рад недапушчальных недарэчнасьцей, нядбайнасьці і нават злачынства ў адносінах да пытаньня будаўніцтва. Гэтыя факты сьвідчаць аб пагрозе зрыву плянавых заданьняў. Калі адразу ня вынішчыць усе гэтыя недахопы, дык ёсьць небясьпека, што пляны будаўніцтва ня будуць выкананы.

Тэмпы будаўніцтва вельмі марудныя

Пагроза зрыву будаўніцтва стварылася ў асноўным з прычыны нядбайнасьці і пакладаньня на самацёк пасобных кіраўнікоў будаўнічых вучастак, злачынная бязьдзейнасьці некаторых тэхнічных кіраўнікоў і ніжэйшага тэхкладу—тэхнікаў, дзесятнікаў, а таксама з прычыны нядбайнасьці некаторых кіраўнікоў саўгасаў і МТС і мясцовых савецкіх і грамадзкіх арганізацый.

Вось факты, якія характарызуюць нядапушчальна марудныя тэмпы будаўніцтва. На 1-га ліпеня ледзь выканана 10 проц. пляну, у той час калі на 1-га чэрвеня павінна было быць выканана ня менш як 36 проц. На пасобных будаўнічых вучастках процант выкананьня пляну вельмі нізначны. Так, 5 вуч.—Зембіна—выканаў плян на 3 проц., 6-ы вуч.—Капыль 4 проц., 12 вуч.—Клімавічы—4 проц., 19 вуч.—Мазыр—3,5 проц., 16 вуч.—Полацак—6 проц., 21 вуч.—Касьцюковічы—6½ проц., 8 вуч.—Чэрвень—7 проц., 17 вуч.—Крупскі—7,5 проц. і г. д. Толькі па некаторых вучастках намецілася некаторы пералом у галіне будаўніцтва. 3-ці вуч.—Заслаўскі—выканаў плян на 20 проц., 18-ы вуч.—Бабруйскі—17,4 проц.

Калі-ж зьвярнуцца да выкананьня будаўніцтва па пасобных пунктах, дык тут процант значна хістаецца. Ёсьць пункты, дзе будаўніцтва зусім не пачата ці выканана ў вельмі нязначных разьмерах. Напрыклад, саўгасы Доктаравічы, Паўлаўка, Вайнілы, Бабівічы, Клімавіцкая МТС.

Вярбоўка рабочай сілы праходзіць самацёкам

Галоўная прычына такога нізкага процанту выкананьня будаўніцтва тоіцца ў недахвацe рабочай сілы. Большасьць будаўнічых вучастак забясьпечана ня больш як на 30—35 проц. патрэбнай колькасьці рабочых: Толькі па некаторых вучастках забясьпечэньне рабочай сілай больш-менш адвальняючае,—на 11 вуч. на 50—60 пр. даходзячы ў пасобных саўгасах да 200 проц.

Трэба з усёй рашучасьцю адзначыць, што незабясьпечанасьць будаўніцтва рабочай сілай менш за ўсё можа тлумачыцца аб'ектыўнымі прычынамі (недастача будаўнікоў ізогул, адлёў на палявыя работы і г. д.). Галоўную ролю тут адыгрывае поўная незацікаўленасьць да пытаньня вярбоўкі рабочае сілы з боку кіраўнікоў вуч., тэхнічных кіраўнікоў і тэхнічнага складу вуч. У гэтай галіне пануе паўнейшы самацёк, а ў пасобных выпадках злачынное галавацяпства, адсутнасьць арганізаванасьці і плянавасьці ў рабоце, няўменьне правільна расставіць сілы, правільна падыйсьці да рабочых, наладжа мабілізаваць гра мадзкую думку і т. д. Ня меншая адказнасьць у гэтай справе кладзецца і на пасобных кіраўнікоў саўгасаў і нізавых савецкіх і прафсыянальных органаў, якія стаяць у баку ад справы будаўніцтва.

Вярбоўка рабочых праходзіць вельмі марудна і бяз удзелу грамадзкасьці, вакол гэтага пытаньня не вядзецца ніякай растлумачальнай работы. Няма плянавасьці ў вярбоўцы рабочых. Бываюць выпадкі, калі едуць шукаць цесьляроў, а прывозяць грабароў (на 17 вуч. з 40 рабочых завезеных са Смаленшчыны было даля 3-х цесьляроў).

Нічога ня робіцца каб замацаваць на будаўніцтве заверабаваных рабочых, у выніку гэтага стварылася вялікая цякучасьць рабочае сілы. Значную ролю ў гэтай справе адыгрывае адсутнасьць належных бытавых умоў. У большасьці месц ня ўсе рабочыя забясьпечаны матрацамі, у памяшканьнях бруд і шмат паразітаў (саўгасы «Зара Захаду», Цяцэрына і г. д.). Ня ўсюды належна арганізавана трамадзкае харчаваньне, у саўгасе Старае Сяло хлеб выпякаўся з дрэннай мукі. Такое-ж самае становішча наглядаецца ў саўгасах Крывое, Цімановічы, і Клімавіцкае—МТС. Па некаторых саўгасах рабочых будаўнікоў ставяць у горшыя ўмовы чымся сваіх рабочых; ў саўгасе Цяцэрына сваім рабочым давалі па 800 грам хлеба ў дзень, а рабочым—будаўнікам — 500 грам. Прымацаваць не будаўнікоў да разьмеркавальнікаў, якія маюцца ў саўгасах, рэдка дзе праведзена і ад тэтым ніхто не клапаціцца.

Райсельспажыўтаварыствы праяўляюць нядбайнасьць у адносінах забясьпячэньня будаўнікоў прадуктамі харчаваньня. У лепшым выпадку будаўнікі забясьпечваюцца на 25—30%, бываюць выпадкі калі зусім нічога не адпускаецца (Гроэскае райспажыўтаварыства).

У радзе месц стварыліся нездаровыя ўмовы пры вярбоўцы рабочай сілы. Не дапушчальным зьяўляецца такое зьявішча, калі некаторыя кіраўнікі саўгасаў выдаюць прэміі рабочым каб толькі залучыць іх на работы. Кіраўнік саўгасу Доктаравічы перацягваў на будаўніцтва дому рабочых тым, што выдаваў кожнаму па 1—2 пары ботаў, 8 цэнтнэраў бульбы і г. д. Зразумелая рэч, што пры існаваньні такога ажыётажу ваколічнае насельніцтва ня пойдзе на работу на будаўнічыя вучасткі дзе кожнаму рабочаму нельга выдаць па 2 пары ботаў.

На некаторых будаўнічых вучастках мала зьвяртаецца ўвагі на разьвіцьцё сацыялістычных метадаў працы: ударніцтва і сацспаборніцтва не практыкуецца, там дзейнічаюць выключна адміністрацыйным праваднам. Ня можа спрыяць замацаваньню рабочае сілы і тое, што на некаторых вучастках заработная плата ня выплачваецца на 2 і больш месяцаў (саўгасы Крывое, Каменка і інш.).

Там дзе на справу вярбоўкі рабочай сілы зьвернута належная ўвага, дзе вакол гэтага пытаньня арганізавана грамадзкая думка, вярбоўка рабочых ідзе больш-менш пасьпяхова. Маецца значны прыліў рабочых на 6-м, 17-м і 18-м будаўнічых вуч. Там сама добра ўплывае на замацаваньне рабочае сілы актыўная работа рабкомаў саўгасаў. Калі рабкомы вядуць выхаваўчую работу сярод будаўнікоў, клапацяцца аб іх дабрабыце-харчаваньні, памяшканьнях, замацаваньне да разьмеркавальнікаў на прамтавары (саўгас Халопенічы, Дубровенская МТС і інш.); там, дзе кіраўнікі саўгасаў зьвяртаюць сур'ёзную ўвагу на будаўнікоў, выдзяляючы ў паасобных выпадках фонды прамтавараў, бульбы і інш. (саўгасы Райцы, Борки, Палевічы і інш.); там, дзе нізавыя органы прымаюць актыўны ўдзел у справе будаўніцтва, дапамагаюць вярбоўцы рабочых (Копыльская Райвыканкцыя працы, Райкалгасаюз і некаторыя сельсаветы),—там, будаўнікі замацоўваюцца на будаўніцтве, там забясьпячэньне рабочай сілы здавальняючае. Нажаль, такія рабкомы і кіраўнікі саўгасаў і раённых арганізацый налічваюцца толькі адзінкамі.

Выкарыстаць мясцовы матар'ял

Вельмі часта будаўніцтва тармозіцца з прычыны несвачасовай дастаўкі падвозкі будаўнічых матар'ялаў. У большасьці пунктаў адчуваецца востры недахват піламатар'ялаў; гонты, цэглы, цьвікоў, цэмэнту, паклі, вапны ды інш. Трэба адзначыць, што гэтая ,вастрата па большасьці будматар'ялаў значна дапала-б калі-б кіраўніцтва будаўнічых вучасткаў, саўгасаў і МТС своячасова аб гэтым паклапацілася і скарыстала ўсе мясцовыя магчымасьці. У большасьці саўгасаў маюцца цыркуляркі, гантарэзкі і інш. дрэваапрацоўчыя варштаты, але яны амаль не працуюць. Ніхто не клапоціцца аб тым, каб набыць патрэбныя пілы, рухавікі і іншыя прылады. У саўгасе Халопенічы, напрыклад, не скарыстоўваюцца ўсім спраўныя цыркулярка і рухавік з прычыны нядбайнасьці прараба Бялясва. Такі-ж малюнак наглядаецца і ў радзе іншых месц. Між тым, пуск усіх гэтых варштатаў і поўная іх нагрузка маглі-б амаль цалкам забясьпечыць будаўніцтва мясцовымі піламатар'яламі і гонтамі.

Таксама нічога ня робіцца каб замяніць дорага каштуючую паклю звычайным мохам. Адна тона паклі каштуе на месцы каля 350 рублёў, у той час як моху можна дастаць колькі хочаш па 5—10 руб. за воз у 3—3½ цэнеры.

С. Я.

Плешчаніцкі РВК сьвядома зрывае рэалізацыю ўборачных машын

Праз некалькі дзённых дзён пачынаецца ўборка абожжа. Сёлетняя ўборка больш чым уборка мінулых год патрабуе правільнай расстаноўкі нашых магчымасьцяй: як жывой сілы, так і машын. Аднак гэтага ня хочуць ведаць некаторыя раёны.

У раёнах: Лельчыца, Асьвея, Брагін, Бабруйск — ляжыць вялізарная колькасьць лішніх сельска-гаспадарчых машын, гаспадары якіх і ня думаюць аб рэалізацыі гэтых машын. Такое нядбайства творыцца ў той час, калі ў некаторых раёнах машыны не хапае.

Плешчаніцкі райвыканком яшчэ большае творыць свавольства. Райвыканком вынес пастанову, у якой выразна (ды толькі па галаваціпску) сказана, што машыны з раёну выпускацца ня будуць.

У апошні час рабочыя «Чырвонага Мэтальста» пры ўпартай працы і пры дапамозе брыгады рэдакцыі «Савецкай Беларусі» дабіліся выпуску першае партыі бульбакапалак. Недапушчальным зьяўляецца толькі тое, што аб гэтых першых ластаўках нічога ня ведае Белсельдзяржснаб.

Белкалгасцэнтр яшчэ не сабраўся, ведаеце, паклапаціцца аб тым, каб своячасова даць нарад Белсельдзяржснабу на завоз малатарнуў «Эдзі», якія павінны ўжо накіроўвацца ў раёны, бо час уборкі лёну ня надта далёка. Белкалгасцэнтр мабыць думае давэць нарады на завозку «Эдзі», тады, калі пачнецца ўборка лёну.

У некаторых раёнах машыны іржавеюць на складах (Слуцак), ад чаго псуюцца. Аб гэтым сыгналізавала «Савецкая Беларусь», але што пішацца ў газэтах, дык гэта, бачыце, яшчэ не зьяўляецца аўтарытэтам для некаторых працаўнікоў Белсельдзяржснабу (спэцыяліст па групе сельска-гаспадарчых машын Караневіч) і яны ніякіх захадаў ня прымаюць.

М. Варанецкі.

Кагану самакрытыка не падабаецца

(ВІЦЕБСК)

Гэтымі днямі рабочыя 4-абрык «Сьцяг Індустрыялізацыі» і «Прафінтэрн» заслухалі даклад аб дзейнасьці свайго ЗРК. Але дакладчык—старшыня ЗРК т. Каган—ні словам не абмовіўся аб перабудове работы згодна апошніх дырэктыў партыі і ўраду.

Выступіўшыя ў спрэчках рабочыя адзначылі непрыстасаванасьць ЗРК да палепшаньня абслугоўваньня пайшчыкаў. На 10 тысяч пайшчыкаў ёсьць толькі 2 харчовыя крамы і 1 крама прамтаварная. Гэта выклікае вялікія чаргі... ЗРК не забясьпечвае ў першую чаргу ўдарнікаў. ЗРК дрэнна забясьпечвае пайшчыкаў гародніной.

Але гэтая крытыка не спадабалася Кагану. У сваім заключным слове замест прызнаньня адзначаных недахопаў і мабілізацыі мас на іх ліквідацыю, Каган выступіў супроць крытыкаваўшых. Работніцы т. Зубкінай, якая крытыкавала дзейнасьць ЗРК, т. Каган адказаў: «Зубкінай ня сьлед было крытыкаваць работу ЗРК, бо яна ўсе тавары ўжо атрымала». Гэты адказ паказвае, што Каган зажымшчык самакрытыкі, што ён ня здолен зьніпчыць недахопы, якія маюцца ў працы ЗРК.

Бюро парткалектыву павінна прыняць усе захады да аздараўленьня работы ЗРК, а зажымшчык самакрытыкі Каган не павінен стаяць на чале ЗРК шэйнікоў.

Наум Абезгаўз.

Тут зруху няма

Пры саўгасе імя Будзённага (Менская прыгарадная гаспадарка) у гэтым годзе арганізавана сталоўка МЦРК.

Гэтая сталоўка пабудавана з мэтай абслугоўваньня рабочых данага саўгасу і ў першую чаргу рабочых Менбуду, якія тут працуюць на пабудове.

Здаецца, што сталоўка павінна стаць сапраўдным дапаможнікам работы, але гэтага няма.

МЦРК зусім дрэнна забясьпечвае сталоўку прадуктамі. На працягу 2-х месяцаў рабочых кормяць адным просам.

Напрыклад, у канцы чэрвеня месяца ў сталоўку прыбыла рыба, але яна была на палову гнілая.

Саўгас для сваіх рабочых, а таксама і для будаўнікоў адпусьціў для сталовак на ўбой карову, але палова мяса ў выніку недагляду сапсавалася.

Усё гэта гаворыць аб разьгільдзяйстве ў справе рабочага забясьпячэньня. Яшчэ горш тое, што працаўнікі сталовай, а ў прыватнасьці загадчык сталоўкі, дрэнна адносяцца да сваёй работы.

Працаўнікі сталовай значную колькасьць харчоў расьцягваюць са сталовай.

Рабочы кантроль адсутнічае.

Пры саўгасе таксама маецца ларок МЦРК, але і тут у забясьпячэньні прамтаварамі і інш. прадуктамі справа абстаіць ня лепш.

У ларку акрамя цукерак нічога няма.

Зрыўшчыкаў у справе рабочага забясьпячэньня патрэбна прыцягнуць да суровай адказнасьці. Пяцідзёньнік павінен даць належны зрух у справе рабочага забясьпячэньня.

А. Заслаўскі.

Сыгналы не пачуты

Газэта саўгасу імя Лекерта «Чырвоны Саўгасавец» сыгналізавала аб адмоўных баках каапэрацыі, якая маецца ў саўгасе, але-ж гэтых сыгналаў не пачулі ні адміністрацыі, ні рабкам, ні партыйная і камсамольская ячэйкі. У краме пануе поўная безгаспадарчасьць ,антысанітарныя. Тавары раскіданы па прылаўках.

Прадукты спажываньня адпускаюцца рукамі. Пасьля водпуску селядцоў, голымі рукамі адпускаюцца цукеркі і іншыя рэчы. Прамтавары адпускаюцца ўсім, нават і спэкулянтам.

Каапкамісія дае атрымліваць тавары каму хочаш. Пераважна лепшыя прамтавары забірае ў першую чаргу сабе. Крама ў саўгасе ў большасьці на замку. Загадчык крамы Трыбушэўскі і там. Баталаў займаюцца гульнямі па саўгасе. Яны ня цікавяцца работай, стаяць у баку ад работы каапэрацыі. Пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б аб перабудове каапэрацыі ідзе не абгаворвалася.

Ударнік.

Аб ударніцтве ў друку

Рэзалюцыя ўсесаюзнай нарады пры „Правде“, да якой далучыўся II усебеларускі зьезд рабсельваенкораў

1. Сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце, агульны ўздым гаспадарча-палітычнай актыўнасьці мас, які выявіўся ў сацыялістычным спаборніцтве і ўдарніцтве мільёнаў, знай шоў свой адбітак у рабселькораўскім руху. Ня гледзячы на спробы з боку тав. Бухарына на IV усесаюзнай рабсельўкораўскай нарадзе навязаць руху апартуністычныя ўстаноўкі, раб селькораскі рух бурна рос колькасна і якасна, павысілася арганізаванасьць, якая рбла друку, як барацьбіта за бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, як барацьбіта за генэральную лінію партыі. Асабліва яркі гэта выявілася, побач з ростам раённага, фабрычна-заводзкага і калгаснага друку, у разгортваньні магутнага ўдарніцкага руху ў друку, у новай вядучай форме рабселькораўскага руху і ўдзеле мас у друку, ва ўдарных брыгадах, якія зарадзіліся і асабліва шырока разгарнуліся вакол ЦО «Правды».

2. Ударнікі як агульнага, так і нізавога (заводзкага, калгаснага і г. д.) друку разглядаюць свой удзел у барацьбе бальшавіцкім друку, як працяг сваёй ударнай работы на вытворчасьці, як працяг сваёй барацьбы за генэральную лінію партыі, за бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва на заводах, фабрыках, калгасах. Нарада адзначае што работа ўдарнымі брыгадамі ўздымае рабселькораўскі рух на вышэйшую ступень, уздымае кіраўніцтвам рэдакцый нашых газэт ударныя брыгады да пастаноўкі прынцыпова-палітычных і гаспадарчых пытаньняў, актуальных на кожным даным адрэзку часу.

Ударныя брыгады друку зьяўляюцца адзнэй з форм ажыцьцяўленьня кантролю найшырэйшымі пралетарскімі масамі над работай дзяржапарату і канкрэтнай барацьбы з бюракратызмам, коснасьцю, праваапартуністычнай практыкай і «левымі» загібамі.

Ударныя брыгады ствараюць калектыўныя карэспандэнцыі, што забясьпечвае найбольш правільны падыход да ацэнкі самых складаных зьявішчаў нашага гаспадарча-палітычнага жыцьця, усебаковае і глыбокае вывучэньне працэсаў сацыялістычнага будаўніцтва. Дзякуючы таму, што ўдарнікі друку зьяўляюцца ўдарнікамі бальшавіцкіх тэмпаў на вытворчасьці, дасягаецца вялікая апэрацыйнасьць газэтнага матар'ялу.

3. Ударныя брыгады, як гэта паказвае двухгадовы вопыт існаваньня ўдарных брыгад «Правды» і раду іншых газэт, апэрацыйна ўдзельнічаючы ў розных формах масавай работы друку («рэйдах», «налётах», пастох і г. д., якія праводзяцца на розных вучастках сацыялістычнага будаўніцтва), зьяўляюцца адзнэй з форм падрыхтоўкі ў адносна кароткія тэрміны кадраў гаспадарчых, прафэсыянальных, савецкіх і партыйных работнікаў, а таксама журналістаў з асяродзьдзя рабселькораў. Асабліва вялікае значэньне мае ўдарны рух у друку, як форма падрыхтоўкі пралетарскіх кадраў з карэннага насельніцтва ў саюзных і аўтаномных рэспубліках і абласьцях і ў нацыянальных раёнах.

4. Удзел ударных брыгад ва ўсёй масавай рабоце друку на праверцы вынікання дырэктыў партыі ў розных галінах нашага сацыялістычнага будаўніцтва, вывучэньне работы саўпарату і кіраваньня рознымі галінамі сацыялістычнай гаспадаркі, выхоўвае ўдарнікаў друку, як актыўных памочнікаў і ўдзельнікаў работы, якая праводзіцца органамі рабоча-сялянскай інспэкцыі і ўрадавымі камісіямі выканьня.

5. Двугадовы вопыт існаваньня ўдарных брыгад пры ЦО «Правде» цалкам і поўнасьцю апраўдаў сябе і даказаў, што вядучай формай рабселькораўскага руху на даным этапе разгорнутага сацыялістычнага наступленьня на ўсім фронце, становяцца ўдарныя брыгады. Ня гледзячы на гэта, роля ўдарных брыгад недаацэньвалася. Асобныя журналісты аказалі простае супраціўленьне разьвіцьцю ўдарных брыгад друку.

Ставячы задачу ўсямернага разгортваньня ўдарніцкага руху, нарада заклікае работнікаў друку і рабселькораў да рашучай барацьбы з супраціўленьнем і праваапартуністычнай недаацэнкай з боку асобных груп работнікаў друку справы разгортваньня ўдарных брыгад, ўцягненьне праз гэту форму рабселькораўскага руху найшырэйшых мас пралетараў, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў у актыўны ўдзел у бальшавіцкім друку. Разам з тым, нарада падкрэсьлівае, што перабудова масавай работы друку на рэйкі ўдарніцтва ні ў якім разе не павінна прыводзіць да ігнараваньня рабселькора-адзіночкі, да пра ігнараваньне рабселькора - адзіночкі пры тым становішчы, калі сотні тысячы рабочых у індывідуальным рабкораўстве знаходзяць шлях выяўленьня сваёй грамадзкай актыўнасьці і для разгортваньня самакрытыкі для барацьбы за бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, зьяўляецца ні чым іншым, як праяўленьнем «левых» загібаў у рабселькораўскім руху. Задачы друку ў адносінах да індывідуала-рабселькора заключаюцца ў тым, каб уцягваць рабселькора-адзіночку ва ўдарныя брыгады.

6. У практыцы некаторых газэт (цэнтральных, абласных і нізавых) скажаюцца асноўныя прынцыпы ўдарнага руху як у арганізацыі, так і ў выкарыстаньні створаных імі ўдарных брыгад. Трэба павесьці рашучую барацьбу са скажэньнямі, якія ў асноўным зводзяцца да наступнага:

А. Бюракратычнае скажэньне самой ідэі ўдарніцтва ў друку, што м

АФІЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

пра культбытавое абслугоўваньне рабочых прадпрыемстваў, пераведзеных на сямігадзінны рабочы дзень і бесьперапынны тыдзень

Выслухаўшы даклады Народнага Камісарыяту Працы і Народнага Камісарыяту Асьветы аб культбытавым абслугоўваньні рабочых прадпрыемстваў, пераведзеных на сямігадзінны рабочы дзень і бесьперапынны тыдзень, Савет Народных Камісараў БССР адзначае наступныя асноўныя недахопы ў абслугоўваньні рабочых прадпрыемстваў, пераведзеных на сямігодзінны рабочы дзень і бесьперапынны тыдзень, культпалітасьветныя і бытавымі ўстановамі:

а) жыльлёвае і сацыяльна-бытавое будаўніцтва знаходзіцца ў незадавальняючым становішчы. Па шэрагу прадпрыемстваў няма дзіцячых ясьляў, пляцовак і сталовак. Гаспадарчыя арганізацыі вельмі неўважліва адносяцца да забясьпечаньня культбытавых устаноў памяшканьнямі. Пачатае ў мінулым годзе жыльлёва-бытавое будаўніцтва не забясьпечана заканчэньнем у 1931 г;

б) культмасавая работа праводзіцца зусім незадавальняюча (слаба разгорнута масавая работа па ўцягненьні рабочых у розныя формы аўладаньня тэхнікаю);

в) грамадзкае харчаваньне на шэрагу прадпрыемстваў знаходзіцца ў дрэнным становішчы. Сталоўкі плянава не забясьпечваюцца прадуктамі, не прыстасаваны памяшканьні для сталовак і яны знаходзяцца ў антысанітарным становішчы ;

г) мэдычныя пункты на прадпрыемствах яшчэ не перабудаваді працу для абслугоўваньня ўсіх зьмен рабочых, асабліва начных зьмен.

Для палепшаньня абслугоўваньня рабочых прадпрыемстваў, пераведзеных на сямігадзінны рабочы дзень і бесьперапынны тыдзень, культпалітасьветнымі і бытавымі ўстановамі (дзіцячыя ясьлі, пляцоўкі ,дзённыя дзіцячыя прытулкі, сталоўкі і інш.), а таксама для забясьпечаньня рабочых кватэрамі, што мае ўплыў на выкананьне прамфінпляну ўкараненьне жаночай працы і замацаваньне яе на вытворчасьці, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Прапанаваць Дзяржпляну забясьпечыць будаўнічымі матарыяламі заканчэньне жыльлёвага будаўніцтва і бытавых устаноў, пачатае ў мінулыя гады, асабліва на прадпрыемствах вядучых галін прамысловасьці БССР.

Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Працы разам з ВСНГ, ЦСПСБ, Народным Камісарыятам Асьветы і Народным Камісарыятам Аховы Здароўя вызначыць аб'екты гэтага будаўніцтва.

2. Адзначаючы, што яшчэ ня зроблен пералом у культмасавай рабоце паваротам яе тварам да вытворчасьці, прапанаваць Народнаму Камісарыяту Працы, Народнаму Камісарыяту Асьветы разам з ЦСПСБ на працягу дзьвёх дэкад распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы, якія - б забясьпечылі:

а) лепшае абслугоўваньне начных зьмен;

б) узмацненьне работы з новымі кадрамі рабочых;

в) разгортваньне масавай работы па ўцягненьні рабочых мас у розныя формы аўладаньня тэхнікаю і шырокай вытворча-тэхнічнай прапаганды;

г) абслугоўваньне нацыянальных меншасьцяў на іх роднай мове і арганізацыю сыстэматычнае работы па інтэрнацыянальна-клясавым выхаваньні.

3. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Асьветы разам з ЦСПСБ перабудаваць работу культпалітасьветных устаноў (клюбы, чырвоныя куткі, бібліятэкі) і агітмасавую работу ў адпаведнасьці з запатрабаваньнямі ўмоў і асаблівасьцяй прадпрыемстваў, пераведзеных на сямігадзінны рабочы дзень і бесьперапынны тыдзень (абслугоўваньне кожнай зьмены, цэху, брыгады, рабочых, кэмпэн), скарыстоўваючы адпаведныя перапынкі, зьвяртаючы асаблівую ўвагу на вячэрнія і начныя зьмены.

4. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Асьветы, Радыёцэнтру, ВСНГ разам з ЦСПСБ забясьпечыць радыёфікацыю ўсіх прадпрыемстваў, пераведзеных на сямігадзінны рабочы дзень, разгарнуўшы масавае радыёабслугоўваньне рабочых усіх зьмен.

5. Прапанаваць Белдзяржкіно не позьней як праз дзьве дэкады перабудаваць работу па кіноабслугоўваньні рабочых прадпрыемстваў, пераведзеных на сямігадзінны рабочы дзень, і бесьперапынны рабочы тыдзень прыстасоўваючы работу да кожнай зьмены .

6. Адзначаючы, што не на ўсіх прадпрыемствах ёсьць мэдычныя пункты ў сувязі з тым, што гаспадарчыя арганізацыі не даюць памяшканьняў для работы мэдычных пунктаў, а на тых прадпрыемствах, дзе памяшканьні ёсьць, яны не прыстасаваны для работ мэдычных пунктаў, прапанаваць ВСНГ і Народнаму Камісарыяту Снабжэньня забясьпечыць мэдычныя пункты на прадпрыемствах адпаведнымі памяшканьнямі, а таксама пры новым будаўніцтве і пры капітальным перабудаваньні прадпрыемстваў абавязкова забясьпечыць патрэбныя памяшканьні для мэдычных пунктаў.

7. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Аховы Здароўя забясьпечыць мэдычным абслугоўваньнем рабочых усіх зьмен, а разам з гэтым перабудаваць работу мэдычных пунктаў на вытворчасьці ў кірунку сапраўднага стварэньня з мэдычных пунктаў мэдычных цэхаў, паводле чыннага палажэньня аб іх.

Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Аховы Здароўя не пазьней як праз дзьве дэкады распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы аб перабудаваньні працы мэдычных пунктаў.

8. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Аховы Здароўя забясьпечыць кваліфікаванымі кадрамі мэдычна-санітарныя і бытавыя ўстановы на прадпрыемствах .

9. Адзначаючы зусім дрэннае становішча грамадзкага харчаваньня на прадпрыемствах, пераведзеных на сямігадзінны рабочы дзень і бесьперапынны тыдзень, прапанаваць Народнаму Камісарыяту Снабжэньня і Белкаапсаюзу забясьпечыць бесьперабойную і поўную выдачу нормы прадуктаў харчаваньня, паводле ўстаноўленых норм ,а таксама своячасова размяркоўваць прадукты харчаваньня, забясьпечваючы ўсе зьмены прадпрыемстваў.

10. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Асьветы і Народнаму Камісарыяту Аховы Здароўя разам з ЦСПСБ зараз-жа пачаць перабудаваньне бытавых устаноў (дзіцячыя сады, ясьлі, дзіцячыя дзённыя прытулкі), прыстасаваўшы іх далкам да ўмоў працы работніц на вытворчасьці праз перавод усіх дзіцячых устаноў, якія абслугоўваюць дзяцей рабочых, на бесьперапынны тыдзень, арганізаваўшы ў іх зьменнасьць, каб дапамагчы работніцам у выкананьні прамфінпляну і ў падняцьці іх палітычных і тэхнічных ведаў і актыўнага ўдзелу ў грамадзкім жыцьці краіны.

11. Для ўцягненьня новых жаночых кадраў у вытворчасьць, прапанаваць Дзяржпляну разам з Народным Камісарыятам Асьветы, Народным Камісарыятам Аховы Здароўя, Народным Камісарыятам Снабжэньня не пазьней як праз тры дэкады распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы для 100 проц. ахопу дзяцей работніц дзіцячымі бытавымі ўстановамі да канца 1932 г .

12. Лічачы, што галоўнаю перашкодаю ў правільным разгортваньні сеткі бытавых дзіцячых устаноў зьяўляецца адсутнасьць адпаведнай жыльлёвай плошчы, даручыць, ВСНГ, Белжылсаюзу і інш. будаўнічым арганізацыям ужыць усе захады да пашырэньня жыльлёвага будаўніцтва для бытавых устаноў і вылучыць адпаведную плошчу ў вялікіх жаўтаўскіх дамох пад дзіцячыя ўстановы.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **К. Бэнэк.**

Кіраўнік Справ Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР **С. Кандыбовіч.**

22 ліпеня 1931 г.
г. Менск.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

пра ход сілосаваньня

Савет Народных Камісараў БССР адзначае, што сілоснае будаўніцтва і сілосаваньне ў БССР праходзіць зусім незадавальняюча, а ў Быхаўскім, Брагінскім, Будакашалёўскім, Веткаўскім, Глускім, Дубровенскім, Жлобінскім, Мазырскім, Менскім, Петрыкоўскім, Уваравіцкім і іншых раёнах праца па сілосаваньні амаль не пачата.

На 10 ліпеня 1931 г. плян будаўніцтва ям і траншэй выкананы на 7,2 проц. засілосавана 0,5 проц. Амаль нічога не зроблена ў справе сілосаваньня ў адна асобным сэктары; установка сіласных вежаў выкананa толькі на 1,2 проц.; плян будаўніцтва сіласных вежаў выкананы на 50 проц. Ёсьць выпадкі адгрузкі сіласных веж непоўнымі камплектамі і псаваньня іх пры перавозцы па чыгунцы і выгрузцы: несвоячасова адгружаюцца ў пункты будаваньня веж патрэбныя матарыялы.

Бяручы пад увагу паказанае вышэй, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Абавязаць старшынь раённых выканаўчых камітэтаў, дырэктароў сельскагаспадарчага трэсту т. т. Грэбенчыка, Аўчыньнікава, Мартэнсона, Макушына, Вайцэховіча, Нам. Старшыні Белкалгасцэнтру т. Стрэле, Дырэктара Бел. Аддзяленьня Трактарацэнтру т. Каршакевіча, Старшыню Кіраўніцтва Белхлебажывёлсаюзу т. Журомскага і дырэктароў саўгасаў, пад іх асабістую адказнасьць, поўнасьцю скончыць сіласнае будаўніцтва да 15 жніўня 1931 г., забясьпечыўшы выкананьне пляну па закладцы сілосу ў тэрміны, устаноўленыя Народным Камісарыятам Земляробства.

2. Абавязаць дырэктара Белсельсінабу т. Талапіла на працягу сямі дзён поўнасьцю забясьпечыць тыя саўгасы і калгасы, як'м пасланы драўляныя часткі для вежаў, патрэбнымі матарыяламі (толь, цьвікі, цамэнт).

3. Прапанаваць дырэктару Бел. Аддзяленьня Трактарацэнтру т. Каршакевічу стварыць пры машынна-трактарных станцыях сіласаўборачныя агрэгаты (трактар, касілка, сіласарэзка) і разам з гэтым забясьпечыць сіласарэзкі, якія ёсьць у калгасах пава-раённай дзейнасьці машынна-трактарных станцый трактарамі, правёўшы гэтую працу на дагаворных падставах.

4. Абавязаць Упаўнаважанага Народнага Камісарыяту Шляхоў пры СНК БССР забясьпечыць своячасовую дастаўку сілосных веж і зьнічыць недахопы ў іх перавозцы.

5. Для беспасрэднага кіраваньня сілосаваньнем абавязаць машынна-трактарныя станцыі, саўгастрэсты, Белсельабсяднаньне, Белкалгасцэнтр і Белхлебжывёлсаюз камандыраваць у раёны, якія найбольш адстаюць, адказных працаўнікоў.

6. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Земляробства, Белкалгасцэнтру і кіраўніком саўгастрэстам галоўную ўвагу пры сілосаваньні зьвярнуць на сілосаваньне ў ямах і траншэях і ўжыць усе захады да таго, каб тыя сіласныя вежы, якія пасланы на месцы, былі своячасова пабудаваны.

7. Даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства і Белкалгасцэнтру тэрмінова даць паказаньне саўгасам і калгасам аб тым, што плян сілосаваньня, вызначаны для кожнага паасобнага саўгасу і калгасу ,павінен быць выкананым таму, што паводле вызначаных пляноў сілас уключаецца ў кармовы баланс данай гаспадаркі і на падставе гэтага вызначэньня нормы загатоўкі сена ,саломы і іншых кармовых культур.

8. Абавязаць старшынь раённых выканаўчых камітэтаў і кіраўнікоў гаспадарчых сыстэм і арганізацый рашуча палепшыць падлік працы па правядзеньні сілосаваньня і своячасова ва ўстаноўлены тэрмін падаваць зводку Народнаму Камісарыяту Земляробства.

9. Даручыць рэдакцыям цэнтральных і мясцовых газэт сыстэматычна асьвятляць у друку ход сілоснага будаўніцтва і сілосаваньня.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **К. Бэнэк.**

Кіраўнік Справ Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР **С. Кандыбовіч.**

18 ліпеня 1931 г.
г. Менск.

МЦРК і садавіна менскіх садоў

Паводле пастановы Менгарсавету, усе прыватныя ўласьнікі садоў г. Менску павінны здаць МЦРК 85 процантаў ўраджаю садавіны. Уласьнікі садоў ведаюць аб гэтым. Яны павінны былі заключыць кантракты з МЦРК на здачу садавіны. Агенты МЦРК абы ходзілі ў свой час усе прыватныя сады г. Менску і папярэджвалі аб гэтым уласьнікаў. Аднак, паводле нашых вестак, толькі прыблізна 7 проц. садоў закантрактаваны МЦРК і, значыцца, звыш 90 процантаў прыватных уласьнікаў па тых ці іншых матывах ад кантрактацыі ўхіліліся, спадзяючыся добра нагрэць рукі ад продажу садавіны. Калі меркаваць па цэнах, якія існавалі на яблыкі і ігрушы ў мінулым годзе, дык кожнае дрэва яблыні з сярэднім ураджаем можа ўласьніку даць руб. 40—50 прыбытку, а ігрушы і таго больш.

І ўвесь гэты прыбытак паплыве ў кішэні прыватных уласьнікаў садоў, абкладзеных надзвычайна мізэрным падаткам, а ЦРК ня выкарыстае найлепшай магчымасьці мець садавіну з Менскіх садоў.

Пакуль яшчэ ня позна, трэба было-б прынцыпа рад рашучых мер для акуратнай здачы прыватнымі ўласьнікамі 85 проц. садавіны, а то наблізжаецца час, калі садавіна пачне пасту паць у продаж і ад гэтага будзе мець карысьць прыватнік, абіраючы працоўных надзвычайна дарагімі цэнамі.

Садоўнік.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР

Да міжнароднага чырвонага дню

ЦК МОПР'у БССР прапанаваў усім сваім арганізацыям праводзіць 1-га жніўня, як важнейшую палітычную кампанію. Асноўнай задачай гэтай кампаніі зьяўляецца садзейнічаньне далейшаму ўзмацненьню абароназдольнасьці краіны. Усе сілы, увесь вопыт грамадзкай работы павінен быць скарыстаны на разгортваньне масавай работы МОПР'у ня толькі сярод мопраўскіх мас, але і сярод тых шматтысячных мас, рабочых калгасьнікаў і неарганізаваных колаў насельніцтва, якія яшчэ не ахоплены МОПР'ам.

Да чырвонага дню павінны быць ахоплены агітацыйна-масавай работай усе рабочыя і работніцы прадпрыемстваў, сэзонькі, калгасьнікі, рабочыя саўгасаў і МТС.

Максымальная ўвага павінна быць зьвернута на правядзеньне кампаніі зімовай дапамогі палізьняволеным капіталістычных краін і пабудовы інтэрнацыянальных дзіцячых дамоў.

ЦК МОПР'у БССР узяў на сябе абавязак: **у дзень 1-га жніўня сабраць ня менш як 300.000 руб. у фонд дапамогі палітзьняволеным.**

ЦК МОПР'у БССР зьвярнуўся з просьбай да Менскага, Гомельскага, Віцебскага, Бабруйскага, Аршанскага, Магілёўскага і Мазырскага Райсаветаў Асоавіяхіму 1-га жніўня арганізаваць масавыя выхады мопраўцаў і Асоавіяхімаўцаў у чырвонаармейскія лягеры з тым, каб падзяліць попытам інтэрнацыянальнага выхаваньня ў Чырвонай арміі і ўзмацненьнем абароназдольнасьці краіны.

У Менску будзе арганізавана масоўка ў садзе **«Прафінтэрн»**.

1-га жніўня гарадзкім саветам Асоавіяхіму і камсамолам будзе наладжан карнавал.

За час з 25-30 ліпеня будуць праведзены даклады па прадпрыемствах аб белым тэроры ў капіталістычных краінах і падрыхтоўцы новай вайны з СССР.

Б—ка.

Бэрнард Шоў прыехаў у СССР

НЕГАРЭЛАЕ, 22. (Белта). Гэтымі днямі прыехалі вядомы ангельскі пісьменьнік Бэрнард Шоў, лэдзі Астар і Лорд Астар (кансэрватары, члены парляманту), якія ставяць мэтаю азнаёміцца з агульным становішчам СССР. У Негарэлым Шоў сустракалі: прадстаўнікі «ОГИЗ» Іонаў, ад фэдэрацыі савецкіх пісьменьнікаў—Гладкоў і прафэсар—Коган, ад ангельска-амэрыканскага клюбу і газэты «Москау-Ньюс»—Луіза Стронг.

Наколькі Шоў і лэдзі Астар цікавяцца становішчам СССР можна бачыць з таго, што скарыстоўваючы стаянку цягніка, яны запрасілі Наркома Замежных Спраў— тав. Літвінава, які зваротваўся з-за мяжы, і пачалі агляд вёскі і пасёлку Негарэлае. Зварочваючыся да цягніка, убачыўшы групу жанчын-работніц, якія працавалі на чыгунцы, яны пачалі з імі гутарку, задавалі розныя пытаньні: адкуль яны, як жывуць, колькі гадзін працуюць? Работніцы ад казалі: «Мы ўсе зьяўляемся калгасьнікамі, дзякуючы чаму ў нашых вёсках паявіліся машыны, якія палягчаюць работу і даюць магчымасьць аддучыцца на адыходную работу. Надыйдзе ўборка ўраджаю, зноў пойдзем у свой калгас. У калгасе лепш жыць. Бывае 2 разы ў тыдзень кіно. На вытворчасьці працуем 8 гадзін, зарабляем добра. Жанчына ў нас вольная, прымае ўдзел у судзе і саветах».

Белкаапсаюз і Белхебжывёлсаюз сарвалі кантрактацыю трусоў у II квартале

Гадоўля трусоў, кантрактацыя іх і загатоўка як шкурак, так і тушак маюць вялікае значэньне ў сэнсе павялічэньня экспарту пушнины і вырашэньня мясной праблемы.

Паводле цэнтралізаванага заданьня, у БССР сёлета трэба загатовіць 60.000 шкурак і 42.000 тушак трусоў. ЭКАНА БССР павялічыла заданьне на тушкі да 57.500 штук.

45 проц. усёй гэтай колькасьці прадукцыі трусоў трэба было закантрактаваць у II квартале для здачы яе ў IV квартале і рэшта—падлягае кантрактацыі ў III квартале для здачы ў I квартале 1932 году.

Кантрактацыю і загатоўку трусоў у БССР праводзяць Белхлебжывёлсаюз, Белкаапсаюз і палаўнічая каапэрацыя.

Што зрабілі яны ў выкананьне заданьняў? Работа іх вельмі яскрава выяўлена на нарадзе, якая адбылася гэтымі днямі ў Наркамснабе, пры ўдзеле прадстаўнікоў Наркамснабу, НКЗ, Пушсаюзкату, БКС, БХЖС і палаўнічай каапэрацыі.

Калі палаўнічая каапэрацыя сумленна ўзялася за выкананьне пляну і закантрактавала на 1-га ліпеня, па няпоўных вестках, 41 проц. заданьня па сваіх раёнах (раёны падзелены паміж кантрактуючымі арганізацыямі), дык БКС і БХЖС яшчэ зусім не прыступілі да кантрактацыі.

Даволі сказаць, што БКС нават ня ведае, дзе ёсьць трусы. Ён абмажаваўся высылкай на нізоўкі інструкцыі, якое там ніхто і не прачытаў. У БКС лічаць гэтую справу «дробязьзю», а пры напамінаньні аб кантрактацыі трусоў спасылаюцца на адсутнасьць сродкаў і кармоў. Між тым, сродкі і кармы даўно адпушчаны, застаецца толькі атрымаць іх. Ніводнага труса на сёньняшні дзень па сыстэме БКС не закантрактавана.

У Белхлебжывёлсаюзе пляны кантрактацыі трусоў сарваны. Адно, тое, што ад мая месяца справа трусазагатовак правадзіравала праз 11 кіраўнікоў, якім даручалася правесьці яе, выразна гаворыць пра адносіны БХЖС да загатовак трусоў. Заданьне ня выканана ні на адзін процант.

Недаацэнка важнасьці кантрактацыі трусоў з боку БКС і БХЖС прыводзіць да зрыву выкананьня дырэктыў партыі і ўраду аб рабочым забясьпячэньні. Па радзе раёнаў—Пухавіцкі, Ветрынскі, Сіроцінскі і інш.—разгадавалася шмат трусоў, аднак закантрактаваць іх ніхто ня думае. Нарады на кармы для трусоў адсылаюцца назад, сродкі на кантрактацыю таксама адрочваюцца з прычыны поўнай бязьдзейнасьці БКС, БКЖС і іх нізовой сеткі.

Трэба рашуча пакласьці канец недаацэнцы справы трусагадоўлі. БКС і БХЖС павінны панесьці адказнасьць за зрыў пляну кантрактацыі, накіраваных на забясьпячэньне рабочых мясам і на павялічэньне экспартнага балянсу. З-за беззадказнасьці БКС Менск пазбаўляецца 40 тон трусінага мяса.

На палаўнічую каапэрацыю трэба ўскласьці дадатковую колькасьць пляну для правядзеньня там кантрактацыі трусоў.

Пушсаюзкат павінен